Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 18 1933 г.
№ 132 (4676)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

МАСКВА, ЦК УсеКП(б)—т. т. СТАЛІНУ, КАГАНОВІЧУ, СНК—т. МОЛАТАВУ, ЦО „ПРАВДА“, НАРКАМЗЕМ—т. ЯКАУЛЕВУ

Да 14 чэрвеня—на 20 дзён раней мінулага году БССР выканала плян веснавой сяўбы на 100,1 проц. Засеяна 2.682 тыс. га. У мінулым годзе да гэтага часу было засеяна 2.401 тыс. га—85 проц. Плян па збожжавых выканан да 5 чэрвеня на 100 проц., да 14 чэрвеня выканан па збожжавых на 104,8 проц., бульбе—100,1 проц., Ільне—100 проц. Сяўбу працягваем. Пераключаем сілы на падняцьце папараў, поліва, сенакашэньне, бальшавіцкую падрыхтоўку да свяячасовага правядзеньня ўборкі, абмалоту і на поўнае выкананьне ў тэрмін абавязацельстваў па здачы дзяржаве сельска-гаспадарчых прадуктаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО
Старшыня Саўнаркому БССР ГАЛАДЗЕД
Наркамзем БЭНЭК

БССР ВЫКАНАЛА ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ

НІЯКАГА САМАЗАСПАКАЕНЬНЯ, НЕАДКЛАДНА ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ ПА КОЖНАМУ РАЁНУ, СЕЛЬСАВЕТУ, КАЛГАСУ І АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

УСЕ СІЛЫ—НА ВОРЫВА ПАПАРУ, ПРАПОЛКУ І ПАДРЫХТОУКУ ДА УБОРКІ!

АБ РАБОЦЕ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС, АБ КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙЦЫ І АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ І РАЙКОМАЎ

Пастанова ЦК УсеКП(б)

ЦК адзначае, што арганізацыйны пэрыяд у стварэньні палітаддзелаў МТС і саўгасаў у сучасны момант у асноўным можна пічыць закончаным. Згодна пастановы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК ужо накіравана ў палітаддзелы 10.139 спэцыяльна адабраных партыйных работнікаў, арганізавана 2.776 палітаддзелаў, у тым ліку 2.019 палітаддзелаў МТС. Праўда, выкананьне праграмы ўкамплектаваньня палітаддзелаў саўгасаў яшчэ не закончана. Але выкананьне гэтай задачы не прадстаўляе ўжо цяпер вялікай труднасьці.

Першыя вынікі работы палітаддзелаў МТС за час падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы паказваюць, што палітаддзелы сапраўды становяцца важнейшымі вагарамі партыі ў справе арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў і МТС, ачыстці іх ад кулацка-варожых элемэнтаў, узмацненьня арганізуючай ролі камуністаў і камсамольцаў у калгасах і выпраўленьня недахопаў работы вясковых партыйных арганізацый. Палітаддзелы ператвараюцца ў сапраўдныя цэнтры згуртаваньня перадавых элемэнтаў калгаснай вёскі.

У новай абстаноўцы работы ў вёсцы, якая акрэсьліваецца канчатковай перамогай калгаснага ладу ў барацьбе з прыватнай формай гаспадаркі і разгромам сіл клясавага ворага, яшчэ больш узрастае значэньне масавай палітычнай і арганізатарскай работы палітаддзелаў.

Асаблівую ролю ў далейшым разгортваньні работы палітаддзелаў МТС павінны адыграць партыйныя калгасныя ячэйкі, як важнейшае зьвяно ў справе кіраўніцтва калгасамі. Існуючая пабудова партыйных арганізацый у вёсцы пераважна па тэрытарыяльнай адзнацы не забясьпечвае сапраўднага павароту вясковых ячэек да практычных пытаньняў калгаснай вытворчасьці і згуртаваньня большасьці ўнутры калгасаў вакол партыйна-камсамольскага бальшавіцкага ядра. Вясковыя тэрытарыяльныя ячэйкі, якія складаюцца з камуністаў, працуючых у калгасах і галоўным чынам сельскіх установах (сельсавет, сельспажыўтаварыства, пошта, міліцыя, суд, школа і інш.), дрэнна зьвязаны з калгасамі і мала займаюцца вытворчым жыцьцём калгасаў. Райкомы партыі, ня маючы непасрэднай сувязі з камуністамі калгасаў і апіраючыся ў сваёй рабоце на сельскія тэрытарыяльныя ячэйкі, аказваюцца ў большасьці свае на справе адарванымі ад непасрэднага кіраўніцтва калгасамі, ад калгаснага актыву і ад мас калгаснікаў. У гэтай акалічнасьці хаваюцца прычыны няправільных, а то і проста непартыйных адносін раду райкомаў да палітаддзелаў МТС і саўгасаў.

Новыя ўмовы работы ў вёсцы, канкрэтны падыход да пытаньняў калгаснага будаўніцтва патрабуюць, каб былі створаны ў калгасах моцныя вытворчыя партыйныя ячэйкі цесна зьвязаныя з калгаснымі масамі, прымаючыя непасрэдны ўдзел у вытворчасьці і здольныя ажыцьцяўляць штодзённае кіраўніцтва вытворчым жыцьцём калгасу.

Новыя ўмовы работы ў вёсцы патрабуюць далей, каб былі ліквідаваны трэньні паміж райкомамі і палітаддзеламі і была створана яснасьць у іх узаемаадносінах.

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Перабудаваць існуючыя тэрытарыяльныя вясковыя партыйныя арганізацыі такім чынам, каб побач з тэрытарыяльнымі ячэйкамі сельскіх установаў існавалі спэцыяльна калгасныя вытворчыя ячэйкі. У гэтых мэтах арганізаваць у кожным калгасе з ліку працуючых там камуністаў самастойную калгасную вытворчую ячэйку або кандыдацкую групу пры наяўнасьці адпаведнай колькасьці членаў партыі і кандыдатаў, прычым пры адсутнасьці ў калгасе неабходнай колькасьці камуністаў, камуністы, члены данага калгасу, арганізацыйна выдзяляюцца з сельскай тэрытарыяльнай партыйнай ячэйкі і, арганізуючы вакол сябе спачуваючых і камсамольцаў, членаў данага калгасу, складаюць партыйна-камсамольскае ядро калгасу; у калгасах-жа, ня маючых камуністаў, арганізуецца група спачуваючых на чале са спэцыяльным партарганізатарам, які прымацоўваецца да яе.

2. Камуністы, працуючыя ў данай вёсцы, але не працуючыя ў калгасе (работнікі сельсавету, каапэрацыі, школы, больніцы, пошты, міліцыі і г. д.) аб'яднаюцца ў тэрытарыяльную сельскую партыйную ячэйку.

3. Калгасная ячэйка арганізуе ў пастаянных вытворчых брыгадах партыйныя групы пры наяўнасьці ў брыгадзе ня менш 3 камуністаў і выдзяляе партарганізатара, калі ў брыгадзе менш 3 камуністаў, у брыгады-ж, ня маючыя ні аднаго камуніста, калгасная ячэйка выдзяляе ў якасьці парторгаў спэцыяльна прымацоўваемых да брыгад членаў ячэйкі.

4. Калгасныя ячэйкі, кандыдацкія групы і групы спачуваючых у калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, працуюць пад кіраўніцтвам палітаддзелаў МТС і выконваюць, як абавязковыя для іх, дырэктывы палітаддзелу МТС у межах пытаньняў дзейнасьці МТС, вызначаных пастановай пленуму ЦК і ЦКК ад 7 студзеня 1933 году. Па ўсіх іншых пытаньнях жыцьця вёскі (савецкае будаўніцтва, фінансы, асьвета, прапаганда і інш.) ячэйкамі гэтых калгасаў кіруюць райкомы, роўна як райкомы кіруюць тэрытарыяльнымі ячэйкамі і вытворчымі ячэйкамі калгасаў, якія не абслугоўваюцца МТС, але ўжо па ўсіх без выключэньня пытаньнях.

5. Палітаддзелы інструктуюць і правяраюць работу калгасных ячэек раёну дзейнасьці МТС, робяць зьняцьце і перамяшчэньне сакратароў калгасных ячэек, кіруюць правыбарамі бюро ячэек, зьбіраюць нарады сакратароў калгасных ячэек УсеКП(б) і УсеЛКСМБ, парторгаў брыгад, сходы партактыву, агульныя сходы камуністаў і камсамольцаў гэтых калгасаў па-за раёнам дзейнасьці МТС ня можа рабіцца бяз згоды палітаддзелу МТС.

6. Аб сваіх мерапрыемствах па кіраўніцтве ячэйкамі, у тым ліку па зьняцьці, замене і перамяшчэньні сакратароў партыйных ячэек МТС і калгасаў раёну дзейнасьці МТС, палітаддзел інфармуе райком, прычым у выпадку разгаворсься пытаньне вырашаецца першым сакратаром абкому сумесна з начальнікам палітсэктару.

7. Работнікі, якія камандыруюцца раённымі, абласнымі і краявымі арганізацыямі ў дапамогу калгасам і партыйным ячэйкам раёну дзейнасьці МТС для правядзеньня масавых гаспадарча-палітычных кампаній, накіроўваюцца праз палітаддзелы і працуюць паводле іх указаньняў.

8. Зацьвярджэньне прыёму і выключэньня з партыі, вядзеньне ўліку членаў і кандыдатаў партыі, а таксама спачуваючых і збор членскіх узносаў у калгасах раёну дзейнасьці МТС робяцца райкомам партыі, прычым палітаддзелы абавязваюцца аказваць райкомам у гэтай справе ўсямерную дапамогу.

9. Для большай увязкі работы палітаддзелаў і райкомаў начальнікі палітаддзелаў МТС і найбольш буйных саўгасаў уводзяцца ў склад бюро райкомаў, а начальнікі палітсэктароў МТС адпаведна ўводзяцца ў склад бюро абкомаў партыі (крайкомаў, ЦК нацкампартый), пры гэтым пажадана па магчымасьці часьцей практыкаваць сумесныя выступленьні і сумесныя рашэньні сакратароў райкомаў і начальнікаў адпаведных палітаддзелаў МТС, выпускаемыя за іх сумеснымі подпісамі.

10. Арганізаваць на працягу 1933 году ў кожным палітаддзеле МТС па невялікай агульнадаступнай газэце і ўвесьці ў штат палітаддзелу пасаду рэдактара газэты.

11. Увесьці ў штат палітаддзелу пасаду спэцыяльнага работніка па рабоце сярод жанчын (жанарганізатара).

12. Арганізаваць на працягу 2-3 месяцаў пры кожным палітаддзеле МТС кніжна-газэтны кіёск (парок).

13. Намечанае пастановай ЦК УсеКП(б) прымацаваньне да палітаддзелаў МТС 2.500 кінопересовак закончыць да 1 жніўня гэтага году.

14. Прапанаваць палітКіраўніцтвам НКЗему СССР і Наркамсаўгасаў сумесна з сельгаседзелам ЦК распрацаваць мерапрыемствы па агранамічнай падрыхтоўцы работнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў (агрэсправачнікі, аграпітаратура, завочнае навучаньне).

Падкрэсьліваючы вялізарнае значэньне палітаддзелаў МТС і саўгасаў у справе ўмацаваньня новага ладу ў вёсцы, ЦК УсеКП(б) абавязвае абласныя і раённыя камітэты партыі аказваць гэтым арганізацыям усямерную дапамогу.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальшавікоў)
15 чэрвеня 1933 г.

АБ ПРАПРАЦОЎЦЫ І ЎБОРЦЫ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ, БУЛЬБЫ І ГАРОДНІНЫ

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

Саўнарком СССР і ЦК УсеКП(б) пастанаўляюць:

1. У галіне праполкі, уборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель

а) Правесьці праполку ўсіх пасеваў ільну, прычым на пасевах селекцыйных ільноў на засьмечаных пасевах падвойную праполку, закончыўшы яе не пазьней канца ліпеня.

б) Падрыхтаваць кадры перабяльшчыкаў для работы на ільнаперабільных машынах па дзве зьмены на машыну з ліку лепшых ударнікаў калгаснікаў і забясьпечыць поўнае выкарыстаньне ўсіх ільнаперабільных машын.

в) Правесьці перабленьне ільну ў тэрмін ня больш 8-10 дзён, ні ў якім разе не дапускаючы перастою ільну на корані, і праводзіць перабленьне кожнага вучастку па меры выкананьня на ім ільну, не чакаючы сьпеласьці ўсяго ільну.

г) Забараніць накіданьне ільнянай саломы для зімняга і веснавога расьцілу.

д) Правесьці апрабацыю лепшых па якасьці вучасткаў ільну і канапель.

е) Закончыць рамонт ільнапеньказаводаў да 15-га верасьня.

ж) Арганізаваць асаблівы кантроль са якасьцю прымаемай заводамі трасты і не апрацоўку з тым, каб дабіцца павышэньня выхаду доўгага валакна з турбіннага сырпу.

з) Да 15-га лістапада закончыць пабудову ўсіх новых ільнаканапляных заводаў, забясьпечаных лёкамабілямі.

і) Адзначаючы зусім невыстарчальную работу над канаплямі, якія маюць вялізарнае гаспадарчае значэньне, Саўнарком Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) патрабуюць ад партыйных і савецкіх арганізацый канапляных раёнаў забясьпечыць своячасовую і поўную выбарку пласконі (да канца цьвіценьня), правядзеньне барацьбы са шкодзікамі і такую арганізацыю справы замочкі канапель, пры якой кожнай МТС і калгасу было-б дана ў адпаведнасьці з умовамі раёну поўнае задань не на замочкі максымальна магчымай колькасьці канапель з восені.

2. У галіне апрацоўкі і ўборкі бульбы і гародніны

а) Правесьці па **бульбе** двухразовае ўспульхненьне і акучваньне і адну праполку, па **капусьце**—трохразовую праполку і ўспульхненьне і два акучваньні, па **цыбулі**—трохразовую праполку і ўспульхненьне і адно праполканьне.

б) Правесьці ўборку бульбы за 15-20, а капусты за 10-12 рабочых дзён, шырока ўжываючы выбарачную ўборку гародніны па меры ледасьпяваньня.

в) Шырока ўжыць практыку выдзяленьня ўнутры брыгад спэцыяльных зьвеньняў у 5-10 чалавек для правядзеньня на поўных вучастках усіх работ па апрацоўцы і ўборцы бульбы і гародніны.

г) Вызначыць у кожнай гаспадарцы (саўгасе і калгасе) насенныя плошчы як аднагадовых, так і двухгадовых культур, у разьмерах ва ўсякім разе ня менш патрабуемых для гаспадаркі. Асаблівы кантроль устанавіць за выдзяленьнем насеньнікаў цыбулі і моркві. Абавязаць аблвыканкомы і абкомы поўнасьцю забясьпечыць са сваіх абласных рэсурсаў сяўбу ў 1934 годзе насеньня цыбулі і моркві.

д) Праверыць падрыхтоўку хаваньня і тары для гародніны і гародняга насеньня.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)
І. СТАЛІН.
16 чэрвеня 1933 г.

Аб пастанове ЦК УсеКП(б) па пытаньні работы палітаддзелаў МТС, аб калгаснай ячэйцы і аб узаемаадносінах палітаддзелаў і райкомаў

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Надаючы вялікае палітычнае значэньне пастанове ЦК УсеКП(б) аб палітаддзелах МТС, аб калгаснай ячэйцы і ўзаемаадносінах палітаддзелаў і РК, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Правесьці 20-VI адзіны партдзень з шырокай і канкрэтнай распрацоўкай паказанай пастановы ЦК ва ўсіх партыйных і камсамольскіх арганізацыях Беларусі.

2. Даручыць РК КП(б)Б разам з палітаддзеламі МТС неадкладна прыступіць да перабудовы структуры нізавых парт'ячэек і расстаноўкі партыйна-камсамольскіх сіл у кожнай ячэйцы, сельсавеце і калгасе згодна пастановы ЦК УсеКП(б).

3. Прапанаваць арґінстру ЦК усмесна з ЦК ЛКСМБ пераключыць увесь інструктарскі склад на аказань не РК КП(б)Б і палітаддзелам практычнай дапамогі ў правядзеньні гэтай работы, забясьпечыўшы выразнае выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б).

4. Прапанаваць РК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ уключыць у парадак дня надыходзячых пленумаў РК КП(б)Б і камсамолу гэту пастанову ЦК УсеКП(б).

5. Даручыць т. Картукову, Цасэ і Пыжыкаву ўнесьці на бюро ЦК канкрэтныя прапановы па пытаньнях арганізацыі газэты ў палітаддзелах, кніжна-газэтных кіёскаў, завочнай вучобы і снабжэньня агралітаратурай начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў, а таксама падбору ў склад кадраў палітаддзелаў рэдактароў і жан оргаў.

6. Агітмасу аддзелу ЦК выпусьціць на працягу бліжэйшых дзён блёкнот агітатара па пытаньні пастановы ЦК УсеКП(б). Культпропу надрукаваць пастанову ЦК УсеКП(б) асобнай брашурай, разаслаўшы яе ў кожную ячэйку.

7. Даручыць арґінстру ЦК праверыць выкананьне ўказаньняў ЦК КП(б)Б аб увядзеньні ў склад бюро РК начальнікаў палітаддзелаў МТС і буйных саўгасаў.

8. На бюро ЦК 21 чэрвеня г. г. заслухаць наведамленьні аддзелаў ЦК аб выкананьні данай пастановы.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. ГІКАЛО

на нарадзе сакратароў райкомаў і пампаліт аддзелаў МТС па камсамольскай рабоце

Таварышы!

Толькі што выступаўшы да мяне прамоўца тут на нарадзе гаварыў пра тое, як мы добра справіліся з сяўбой і што тым лепш мы павінны справіцца з праполкай і ўборкай.

Гэта, таварышы, ня зусім так. Сяўба ў нас праходзіла па Беларусі кепска, хоць правільна, што сяўбу мы па Беларусі ў гэтым годзе скончылі раней, чым у мінулым годзе, прычым у мінулым годзе мы недавыканалі плян па яравой сяўбе прыблізна на 8-10 проц.

Але нельга параўноўваць цяперашні год з леташнім. Гэта значыць, не разумець таго, што мы маем ва ўсім Савецкім саюзе і, у прыватнасьці, у нас па БССР. У гэтым годзе мы маем, па-першае, значна лепшы палітычны настрой сярод сялянства і калгаснікаў. Калі ў мінулым годзе мы мелі выхады калгаснікаў з калгасаў, а ў асобных раёнах гэтыя выхады насілі масавы характар, то ў гэтым годзе мы ня толькі ня мелі выхадаў, а наадварот, ёсьць вялікая цяга сярод аднаасобнікаў у калгасы. За гэту вясну ў калгасы па БССР улілося паводле далёка няпоўных даных больш за 50 тыс. новых гаспадарак. Па-другое, значна палепшыўся матар'яльны дабрабыт сялянства.

У мінулым годзе мы мелі нядрэнны ўраджай, прычым сяляне Беларусі ад валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі здалі дзяржаве па розных загатоўках ня больш 6 проц. Харчовыя рэсурсы нашых калгасаў у асноўным больш чым здавальняючыя. Нашы калгаснікі забясьпечаны і хлебам і бульбай. Гэта ня гледзячы па кепскую работу па сяўбе мінулага году, калі ледзь 10 проц. пасеўнай плошчы было незасеянай. Якасьць апрацоўкі зямлі ў мінулым годзе таксама была не на вышыні. Колькі ў нас было агрэхаў, колькі было неахайнасьці пры правядзеньні пасеўнай кампаніі?! Ня зусім добра ў нас праходзіла і ўборка. І тым ня менш нашы калгасы выйшлі з харчамі добра. Нашы сяляне ў калгасах ужо жывуць лепш, чым раней. Гэта і прывяло да таго, што вясной гэтага году мы мелі вялікі прыліў у калгасы. Кожны працоўны селянін на практыцы пачынае пераконвацца ў перавазе калгаснага ладу.

Да недахопаў леташняй пасеўнай кампаніі трэба аднесьці і тое, што мы пачалі займацца сяўбой позна, па сутнасьці з 15-20 мая. Гэта спрыяла зацяжваньню сяўбы.

У гэтым годзе мы сяўбой пачалі займацца з красавіка месяца. І мы мелі ўсе ўмовы для таго, каб разгарнуць масавую сяўбу з 15 красавіка. Надвор'е было добрае. І, калі-б як належыць завярнуць, мы-б сяўбу скончылі ў 20-тых лічбах мая. Гэта зусім ясна.

Але мы сустрэліся з цэлым радам фактаў, якія тармазілі мабілізацыю мас на скончэньне сяўбы ва ўстаноўленыя партыяй тэрміны. Па-першае, мы мелі заядлае супраціўленьне в боку многіх нашых арганізацый раённай сяўбе. Я асабіста сам атрымаў ліст ад сакратара парт'ячэйкі і асобных членаў партыі і камсамольцаў, якія пісалі так: «Бачыце, ёсьць пастанова ЦК і СНК аб тым, каб сеяць авёс з 15 красавіка. Але надвор'е кепскае, глеба сырая, як-жа можна цяпер сеяць. Гэта проста шкодніцтва». Выходзіць так, што ЦК і СНК займаюцца шкодніцтвам. «Нам бацькі і дзяды гаварылі, што раней 5 мая авёс сеяць нельга, а тут кажуць сейце з 15 красавіка».

І тут трэба проста сказаць, што з боку камуністаў і з боку камсамольцаў ня быў даны сапраўдны бальшавіцкі адпор гэтым адсталым настроям, якія дзейнічаюць на руку кулаку. Многія з нашых камсамольцаў ня мелі ў мінулым вялікага гаспадарчага вопыту і, уступаючы ў калгас, паверылі старым, паверылі ў старыя дзедаўскія традыцыі, замест таго, каб рашуча абверчнуць на справе гэту коснасьць, павярнуць вёску на новы шлях.

Гэта гаворыць таксама пра тое, што многія з членаў партыі і камсамольцаў ня маюць ніякага ўяўленьня аб агранаміі, больш таго, ня хочуць авалодваць новай тэхнікай і ведамі ў галіне сельскай гаспадаркі. Гэта адна з прычын таго, што мы ня зусім хутка перамагаем старыя дзедаўскія традыцыі і коснасьць у справе разгортваньня масавай сяўбы.

У правядзеньні сяўбы ня былі ўлічаны і тыя ўрокі, якія мы мелі ў ходзе збожжазагатовак. Колькі было на мясцох напісана рэзалюцый аб барацьбе з гнілым лібералізмам, аб барацьбе з славеснай дэкларацыйнасьцю, а ўсё-ж гэта славесная дэкларацыйнасьць мела месца і пры правядзеньні сяўбы.

Вазьмеце, напрыклад, пытаньне з аўсом. Мы ў мінулым годзе вельмі шмат спрацілі на аўсе. Гэта здарылася таму, што мы вельмі позна сеялі авёс, сеялі дзедаўскімі спосабамі пры кепскай апрацоўцы зямлі. Таму нам не хапіла кармоў для жывёлы.

Позна сеяць авёс гэта простае злачынства. Ён не пасьпее, а вось у нас ва многіх мясцох ёсьць такія партыйцы, якія думаюць, што з аўсом можна пачакаць, пазьней пасеяць. Напрыклад, Віцебск і іншыя раёны яшчэ датэтуль ня выканалі плану пасеву аўса. Гэта ёсьць рэзультат апартуністычнай недаацэнкі значэньня раньняй сяўбы, гэта ёсьць рэзультат самацёку ў рабоце. А што такое самацёк у пераводзе на палітычную мову. Гэта апартунізм стопроцантны. А вось у нас ёсьць людзі, якія лічаць, што можна не арганізоўваць работу і шырокія калгасныя масы, пакладаючыся на рэзалюцыю і лічачы, што загадам можна ўсё зрабіць.

Вазьмеце Віцебск. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва Віцебску ўвесь час запэўнівала, што Віцебск выдучы раён: «У нас, бачыце, больш за 20 тыс. рабочых, буйныя прадпрыемствы «Сьцяг індустрыялізацыі», «КІМ» і інш., вялікая партарганізацыя, плян сяўбы ў нас нязначны — 20 тыс. га, мы ўсіх шапкамі закідаем». І вось людзі замест таго, каб па-бальшавіцку ўзяцца за справу, улічыўшы вопыт загатовак, арганізаваць і расставіць людзей, накіраваць іх на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы сяўбы, разьбіць апартуністаў і сабатажнікаў, якія разьлічваюць па самацёк у справе правядзеньня сяўбы — вядуць гутарачкі: «Пасеяць для нас — гэта плёвая справа». Так могуць развважаць толькі работнікі, якія страцілі пэрспэктывы ў рабоце, не разумеюць або не жадаюць зразумець, як сёньня трэба працаваць.

У нас ёсьць цэлы рад фактаў, калі некаторыя раённыя арганізацыі, ячэйкі па-баявому не рэагуюць на апартуністычныя гутаркі і дзеяньні. Колькі было разважаньняў, прыкладам, такога парадку: «Дожджык ідзе, значыцца, трэба пачакаць тыдзень, бо калі мы з загатоўкамі справіліся, значыцца, і з сяўбой мы таксама лёгка справімся». Людзі не разумеюць, што такія разважайньні ня спрыяюць арганізацыі мас, што гэта вядзе да дэзарганізацыі нашых радоў. Людзі не разумеюць таго, што сяўба ў нашых умовах праходзіць у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы. Усякія разважаньні аб непагодзе, аб дожджыку дзейнічаюць на руку клясаваму ворагу, зацягваюць сяўбу.

Колькі ў нас раёнаў, якія адстаюць з сяўбой?! Вазьмеце паўночную зону. Яна на сёньняшні дзень выканала плян сяўбы на 86 проц. І гэта адставаньне раёнаў паўночнай зоны па сяўбе зьяўляецца ня вынікам таго, што там калгаснікі або аднаасобнікі не хацелі сеяць, або што там выключна цяжкія аб'ектыўныя ўмовы. Не, гэта вынік таго, што ў гэтых раёнах апартуністычна аднесьліся да найвялікшай справы барацьбы за бальшавіцкую сяўбу.

Так мы павінны і абавязаны расцэньваць работу тых арганізацый, якія ганебна цягнуцца ў сяўбе. І будзем так расцэньваць, бо без таго, каб ня вырыць усякія апартуністычныя, антыпартыйныя ўстаноўкі ў арганізацыі работы па сяўбе, без таго, каб не разграміць клясавага ворага і яму падтакваючага, посячага часамі ў кішэні партыйны і камсамольскі білет — бяз гэтага мы справы ня зробім, па-бальшавіцку работу не паставім. Усякія разьлікі на самацёк павінны сустрэць з нашага боку самы рашучы адпор.

Сяўба аўса ў нас у Беларусі ў гэтым годзе прайшла асабліва дрэнна. І ў гэтым годзе, таксама як і ў мінулым, мы мелі супраціўленьне супроць выкананьня пляну пасеву аўса.

Выкрыцьцём кулацкіх тэндэнцый, накіраваных супроць культуры аўса, у нас на мясцох мала займаюцца. І тая акалічнасьць, што мы і зараз яшчэ сеем авёс, сьведчыць аб ганебнай рабоце вельмі многіх раённых арганізацый. Мы павінны былі скончыць сяўбу аўса не пазьней 15 мая. Гэты тэрмін сарваны. Мы гэтага экзамэну ня выпрымалі.

Позьні тэрмін скончэньня сяўбы аўса ня можа не адбіцца на яго ўраджайнасьці.

А гэта ў свае чаргу ня можа не адбіцца на стане конскага паголоўя. Мы мелі вялікае шкодніцтва ў мінулым годзе ў галіне жывёлагадоўлі.

Колькі нам кулакі, шкодзікі і ў гэту вясну загубілі коняй і прывялі іх у такі стан, што на іх нельга было арать і працаваць і ў рэзультаце мы спрацілі ў тэмпах сяўбы, не зматлі своячасова арать, сеяць лён, авёс і іншыя культуры.

А дзе былі нашы партыйныя і камсамольскія арганізацыі? У нас лічаць, што камсамолец можа быць сакратаром райкому, сакратаром камсамольскай ячэйкі ў калгасе і ў МТС і на іншай рабоце. А вось адказваць за стан каня, за стан справы ў калгасе — гэтай адказнасьці не заўсёды патрабуюць ад нашых камсамольцаў і партыйцаў.

А ці нельга так паставіць пытаньне, што калі ў даным калгасе конь выключна цяжкім стане, ня кормлены, коні гінуць, дык найспраўдашную адказнасьць за гэта нясуць тыя камуністы і камсамольцы, якія знаходзяцца ў гэтым калгасе. Я думаю, што гэта мы можам і маем права патрабаваць ад іх. Які-ж ты камсамолец, які-ж ты камуніст, адказны работнік, калі ў цябе пад носам сапраўдная кулацкая шкодніцкая работа і ты або гэтага ня бачыш, або проста маўчыш?! Гэта-ж простае патаканьне кулаку. Тав. Сталін яшчэ на студзеньскім пленуме ЦК УсеКП(б) гаварыў: «Мы вікаваты ў тым, што не разгледзелі новай абстаноўкі і не ўчасьнілі сабе новай тактыкі клясавага ворага, які дзейнічае «ціхай сапай»... «Не ў сялянах трэба шукаць прычыну затрудненьняў збожжазагатовак, а ў нас самых, у нашых уласных радох. Бо мы стаім на чале ўлады, мы маем сродкі дзяржавы, мы закліканы кіраваць калгасамі і мы павінны несьці ўсю паўнагу адказнасьці за работу ў вёсцы».

БОЛЬШ УВАГІ ТРАКТАРАМ І СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ МАШЫНАМ

Кепска стаіць у нас, у БССР, справа з выкарыстаньнем трактарнага парку. Па-мойму, больш ганебнай работы цяжка знайсьці. У нас няма дакладных даных выкарыстаньня трактарнага парку, але з папярэдніх падлікаў відаць, што трактары выкарыстоўваюцца ў нас на 30-35 проц. Хіба мы, камуністы, камсамольцы, можам далей цярпець такія адносіны да трактара? Часта мы бачым і такія адносіны, калі ў калгасе і ў МТС трактар стаіць на нізінным землі, а коні працавалі на вышэйшых мясцох, таму і трактар вышаў з вялікім спазьненьнем на сяўбу і эфэктыўнасьць трактараў была нявысокай.

І трактарысты падрыхтаваны вельмі кепска. Дзе-нід-зе разважаюць так: «Вось ёсьць калгаснік, ён дрэнна абыходзіцца з канём, лепш будзе працаваць на трактары». І апрымліваецца так, што конь загубіў і трактар ламае.

Вазьмеце сельска-гаспадарчыя машыны, сяўкі. І яны часта ў нас поўнасьцю не выкарыстоўваюцца, а калі і выкарыстоўваюцца, дык з імі абыходзяцца вельмі дрэнна. Замест высеву 12 пудоў даюць 6-7 пудоў або яшчэ менш.

Або вазьмеце ільнацерабілку «Камсамолка». Калі яна называецца камсамолкай, дык камсамол павінен быў над ёю шэфствацаць, але, відаць, камсамол лічыць, што на «Камсамолку» ня трэба ніякай увагі зварачаць. І вось атрымліваецца, што ў нас, з прыкладна, 1.400 «Камсамолак» у мінулым годзе дзейнічала нямнога больш 100. Я лічу, што на гэту справу камсамолу ва ўсякім выпадку трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Я на месцы-б «Камсамолак» пагрыўдзіўся (**сьмех**).

Я, таварышы, закрануў некалькі пытаньняў з пасеўнай кампаніі. Вы бачыце, справа стаіць у нас кепска. Вынікі сяўбы гавораць аб тым, што мы дрэнна правялі сяўбу, спазьніліся ў тэрмінах, у той час, як у нас былі ўсе ўмовы для таго, каб мы па сяўбе ішлі ў першых радох у параўнаньні з іншымі абласцямі, краямі. З пункту гледжаньня колькасьці конскага паголоўя або рабочай жывёлы Беларусь знаходзіцца ў лепшым станові: шчы, мы маем 750 тыс. коняй пры пляне 2.680 тыс. га яравога клину. Гэта давоі для таго, каб пры наяўнасьці яшчэ 3-х тысяч трактараў закончыць сяўбу за 3, самае большае за 4 тыдні. А мы сяўбу цягнулі з 15 красавіка да 15 чэрвеня, гэта значыць, што мы працавалі ў два разы горш, чым маглі працаваць. А калі ў мінулым годзе яшчэ больш нацягнулі з сяўбой, значыць у мінулым годзе ў 4-5 раз горш працавалі.

Які вывад з гэтага мы павінны зрабіць, што працавалі мы дрэнна, сяўбу скончылі з вялікім спазьненьнем. І гэта дрэнная работа па сяўбе павінна быць камплексавана пасьпяховай барацьбой па завяршэньні іншых сельска-гаспадарчых работ гэтага першага году другой пяцігодкі.

Працяг на 2 стар.

ПРАЦЯГ ВЫСТУПЛЕНЬНЯ тав. ГІКАЛО

АБ ПРАПОЛЦЫ І УБОРЦЫ

Перш за ўсё, нам трэба забяспечыць своечасовае правядзенне праполкі. Ураджай у гэтым годзе павінен быць вышэй мінулага году таму, што мы сяўбу ў гэтым годзе закончылі на 20-25 дзён раней чым у мінулым годзе. Апрацоўка глебы ў гэтым годзе таксама лепшая чым летась.

Мы павінны ў гэтым годзе па Беларусі загатовіць 550 тысяч тон бульбы, г. зн. больш чым 30 млн. пудоў. З іх мы павінны палову — 15 млн. пудоў бульбы — вывезці ў Ленінград. Мы павінны даць дзяржаве 8,5 млн. пудоў збожжа — хлеба. Мы маем усе магчымасьці для таго, каб выканаць гэтыя задачы. Але для гэтага трэба справу закруціць так, каб усюды адчувалася біцьцё тэмпу нашай бальшавіцкай работы. Трэба арыентаваць кожнага калгасьніка на тое, што збожжазагатоўкі павінны быць закончаны ў жніўні-верасьні месяцы, а па бульбе ў кастрычніку. Мы павінны ўжо ў жніўні даць 3 млн. пудоў збожжа, а гэта значыць, што мы павінны ўжо зараз пачаць арганізоўваць справу падрыхтоўкі да здачы збожжа. Таксама і з бульбай.

Мы павінны, па-першае, арганізаваць раньняе капанье бульбы, мы павінны месць на ўвазе тую акалічнасьць, што звыш 200 тыс. га бульбы засеяна ў пас да 20 мая. Гэта значыць, што бульба паспее ў нас у гэтым годзе значна раней, чым у мінулым. І таму мы павінны арганізаваць масавае капанье бульбы ў першых числах верасьня. Інакш у нас бульба прападзе, пойдзе па руках, пачнецца раскрадваньне і нам значна цяжэй будзе правесьці нашы загатоўкі.

Так працаваць нельга. Мы павінны арганізаваць справу так, каб кожны калгасьнік, кожны пралоўны адпаасобнік бачыў наша кіраўніцтва, нашу дапамогу. Гэта адносіцца і да камсамольцаў, якія зьяўляюцца памочнікамі і актыўнымі работнікамі па выкананьні задач, пастаўленых партыяй. У нас часта бывае так, што парт'ячэек у калгасе і ў вёсцы няма, а вось камсамольская ячэйка ёсьць, і вы, камсамольцы, павінны работу паставіць так, каб дапамагчы калгасьніку і адпаасобніку справіцца з дзяржаўнымі абавязацельствамі. Для гэтага нам трэба правесьці вялікую палітычную і арганізацыйна-масавую работу.

Мы кулака разграмілі і мы павінны яшчэ лепш паставіць нашу палітычна масавую работу. Клясавая барацьба не аслабла. Загатоўкі будуць праходзіць у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы. Мы павінны рашуча выкрыць клясавага ворага, разграміць яго там, дзе ён яшчэ захоўвае свой кулацкі ўплыў. Гэта работа проста зьвязана з тым, у якой меры нам удасца лепш паставіць арганізацыйную і палітычна-масавую работу. Трэба арганізаваць калгасьніка і адпаасобніка так, каб ён з поля вёз-бы лепшую бульбу на здаточны пункт. Трэба арганізаваць гэту справу сваім асабістым прыкладам, сваёй асабістай ініцыятывай, тады шырокія масы калгасьнікаў і адпаасобнікаў сапраўды паверацъ, што іменна так трэба рабіць, што савецкая ўлада яго ўлада, дапамагае яму будаваць новае жыцьцё.

У асабістасьці сёньня, калі мы выйшлі з буйнейшымі перамогамі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, нельга працаваць, як узмацненьнем і ўмацаваньнем нашай арганізацыйнай і палітычна-масавай работы. Трэба на месцах арганізаваць людзей, трэба растлумачыць кожнаму калгасьніку і пралоўнаму адпаасобніку выгоднасьць для яго своечасовага выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай.

Вы ведаеце, што з 1-га жніўня па БССР калгасны гандаль хлебам будзе спынен таму, што мы з гэтага часу прыступаем да абавязковай здачы (пастаўкі) збожжа, бульбы дзяржаве. Кожны селянін, кожны калгасьнік зацікаўлен у тым, каб яму хутчэй дазволілі гандляваць хлебам, каб ён меў магчымасьць весьці на рынак і прадаваць свае лішкі. Трэба ўсіляк растлумачваць гэта. І камуністы і камсамольцы павінны перш за ўсё сябе падцягнуць, каб дрэнны прыклад мінулага году з загатоўкамі не паўтарыўся.

Пытаньне абавязковай здачы дзяржаве збожжа, бульбы павінна быць цэнтральным пытаньнем нашай работы. Для гэтага трэба як належыць арганізаваць уборку і абмалот. У нас, у Беларусі, ёсьць усе магчымасьці, каб за тыдзень, максімум за 10 дзён абмалаціць збожжа. Яраны клін у нас не такі вялікі. І калі мы па-сапраўднаму возьмемся за выкарыстаньне малатарань, коняй, дык мы гэтыя тэрміны вытрымаем. Тут перш за ўсё пытаньне вырашаюць людзі. І камсамольцы павінны прявяць сябе перадавікамі ў арганізаваньні тэхнікай уборкі і абмалоту. Камсамол павінен узяць на сябе шэфства над малатарнямі, над сенажаткай. Гэта асабліва важна для нашай вёскі, дзе ёсьць яшчэ шмат коснасьці, кансерватызму ў выкарыстаньні машын.

Рад раённых арганізацый—партыйных, камсамольскіх і савецкіх—не апраўдалі давер'я партыі ў загатоўках мінулага году. Мы вымушаны былі тады пабіць і моцна пабіць аж да выключэньня з партыі цэлы рад кіраўнікоў раёнаў. Аб чым гаварыць гэтыя факты? Яны гавораць аб тым, што рэвалюцыйная пільнасьць была прытушана ў гэтых работнікаў. Яны ня толькі незауважылі, але часам і зрашчваліся з кулацка-апартуністычнымі элементамі, не жадалі працаваць пачоваму, зьвязваліся з адсталымі элементамі, а ня ручаліся наперад, каб не на словах, а на справе быць будаўнікамі сацыялізму.

Патрабаваньні цяпер да нас надзвычай вырасьлі. У нас цяпер больш чым на 50 проц. праведзена калектывізацыя ў БССР. Цяга адпаасобнікаў у калгасы зьнічная. Колькі ў нас па БССР трактараў, колькі ў нас складаных сельска-гаспадарчых машын, колькі новых прадпрыемстваў?! Растуць новыя людзі, і іх патрабаваньні да нас таксама павышаюцца. Ці можам мы цяпер працаваць такімі мэтадамі, такім парадкам, як раней? Не.

Вы памятаеце, як тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове аб рабоце ў вёсцы на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК гаварыў, што ў цяперашніх умовах партыя ўжо ня можа «абмежавацца асобнымі актамі ўмешваньня ў працэс сельска-гаспадарчага разьвіцьця. Яна павінна цяпер узяць у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за работу, дапамагчы калгасьнікам весьці сваю гаспадарку наперад на аснове даных навукі і тэхнікі... Партыя, калі яна хоча кіраваць калгасным рухам, павінна ўваходзіць ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця і калгаснага кіраўніцтва» **(Сталін).**

БОЛЬШ УВАГІ І ДАПАМОГІ ПАЛІТАДДЗЕЛАМ

Партыя па ініцыятыве тав. Сталіна арганізавала палітаддзелы для палітычнага ўмацаваньня і павышэньня палітычнай ролі МТС і саўгасаў, для рашучага павышэньня палітычнай і гаспадарчай работы нашых ячэек, калгасаў і саўгасаў.

Вы думаеце, што палітаддзелы МТС былі арганізаваны таму, што трактары дрэнна працуюць. Не. Калі-б толькі ў гэтым заключалася справа, то навіду ці трэба было-б зварачацца да арганізацыі палітаддзелаў МТС. Справа значна складаней. Селянін пайшоў масаю ў калгас. Ствараецца новая тэхнічная база ў сельскай гаспадарцы, ствараецца буйная сацыялістычная сельская гаспадарка, а ў той-жа час ня ўсюды кіраўніцтва аказалася на вышыні становішча. Патрэбны былі людзі, якія па-бальшавіцку маглі-б закруціць на месцах работу, вось чаму і пры МТС арганізуюцца палітаддзелы, якія павінны забясьпечыць партыйнае вока і кантроль ва ўсіх галінах работы і жыцьця як самых МТС і саўгасаў, так і абслугоўваемых МТС калгасаў.

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) выразна і ясна вызначыў функцыі палітаддзелаў МТС і саўгасаў і іх ролю. Кароткая па тэрмінах работа палітаддзелаў МТС і саўгасаў у нас у веснавую сяўбу паказала іх вялізарнае палітычнае значэньне ў рабоце як гаспадарчай, так і палітычнай на вёсцы.

Мы нядаўна праверылі, як на месцах ажыцьцяўляюцца гэтыя задачы, і пераканаліся, што ня ўсе нашы раённыя арганізацыі разумеюць палітычную ролю палітаддзелаў.

Нашы раённікі і да гэтага часу яшчэ мала ведаюць калгасную вытворчасьць, нашы сельскія ячэйкі да цяперашняга часу былі арганізаваны па тэрыторыяльным прынцыпе—яны былі жартаны ад вытворчасьці, ад калгасаў і ня ведалі, што ў іх робіцца. Замест барацьбы супроць апартуністычных старых дзедаўскіх традыцый у пытаньнях сяўбы, яны прахлопвалі гэту справу. Бо яны вытворчасьці калгаснай сельскай гаспадаркі ня ведаюць.

Так далей быць ня можа. Мы зараз пасылаем лепшых работнікаў бальшавікоў з гарадоў дапамагчы калгасьніку лепш арганізаваць вытворчасьць, зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгасьнікаў заможнымі. Неправільна думаць, што лёзунг партыі—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі—будзе выкананы самацёкам, без канкрэтнага штодзеннага кіраўніцтва партыі калгасным рухам, без стварэньня моцнага партыйнага кіраўніцтва на сяле, без рашучай барацьбы супроць рознастайных апартуністычных настроеў, элементаў разлажэньня, гнілі, без рашучай барацьбы з рэшткамі разгромленага кулака і яго агентуры. Палітаддзелы арганізаваліся для таго, каб быць арганізатарамі ў справе стварэньня сацыялістычнага новага сяла, у справе хутчэйшага ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі — ператварыць усіх калгасьнікаў у заможных.

Пераважная большасьць партыйных арганізацый зразумела вялізарнае палітычнае значэньне гэтага арганізацыйнага мерапрыемства партыі. Яны зразумелі, што палітаддзелы паскорань наша прасоўваньне да сацыялізму, паскорань пераўтваньне калгасьнікаў у духу сацыялізму.

Але ўсё-ж знаходзіцца ня мала і такіх партыйных арганізацый і камсамольскіх, якія не зразумелі новай абстаноўкі, загрузьлі на старых пазыцыях і часта спрачаюцца аб тым, хто чым павінен займацца, ці не забірае палітаддзел частку работы райкому.

Раённаму камітэту партыі і камсамолу колькі хочаце работы. У іх не пачаты край работы. Толькі спраўлай цеся з ёю. Тут і работа па арганізацыі адпаасобніка, які зьяўляецца заўважнае палітычнае мерапрыемства.

трашнім нашым калгасьнікам і з якім мы па сутнасьці справы мала займаліся.

Звычайна пры стварэньні палітаддзелу пачынаецца пытаньне аб узаемаадносінах: «Ён мне ці я яму павінен падпарадкавацца. Зразумела, раз я сакратар камсамольскай ячэйкі, ён мне павінен падпарадкавацца». Гэта няправільна. Памочнік начальніка палітаддзелу па камсамольскай рабоце павінен быць членам бюро, але ён у сваёй рабоце не падпарадкоўцца РК. Ці дазвалі ўжо на месцах кампанцыю ў бюро РК памочнікаў палітаддзелаў па камсамолу? (Голас з месца—**правялі**). Нешта на верыцца. (Голас з прэзыдыуму—ня ўсюды).

Але гэта яшчэ ня ўсё. Трэба, каб сакратары РК КСМ аказалі ўсямернае падтрыманьне і дапамогу памочнікам па камсамольскай рабоце палітаддзелаў таму, што яны, гэтыя памочнікі, не сядзяць у кабінетах, а жывуць і працуюць у гушчы калгаснай масы і трэба дапамагчы ім, каб яны па самой справе былі сапраўднымі бальшавіцкімі арганізатарамі вёскі.

Палітаддзелы кіруюць калгаснымі, партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі раёну дзеяньня МТС па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з дзейнасьцю МТС. Права зьмяшчэньня сакратароў калгасных і саўгасных ячэек у раёне дзеяньня МТС належыць палітаддзелам. Толькі са згоды палітаддзелаў могуць зьмяшчацца і перамяшчацца работнікі МТС у адпаведныя калгасы. І гэта зусім зразумела. Які-ж ён будзе начальнік палітаддзелу, калі ён ня будзе мець магчымасьці рабіць перастаноўку людзей, ён на гэта мае поўнае права, але павінен даведзіцца аб гэтым да ведама райкому. Іншая справа—райком можа не згадзіцца, тады гэта справа ідзе ў вышэйшую інстанцыю. Інакш райком будзе перашкаджаць палітаддзелу, а палітаддзел будзе перашкаджаць райкому. Тут паміж імі павінна быць поўнае ўзаемападтрыманьне. Наконт гэтага ёсьць яснае ўказаньне партыі. Калі РК КСМ прымае пастанову, зьвязаную з работай МТС, якая абслугоўваецца палітаддзелам, то гэта пастанова павінна быць падпісана і памочнікам начальніка палітаддзелу і па камсамольскай лініі. Гэта пастанова тады мае большую сілу.

Памочнікам начальнікаў палітаддзелаў па камсамольскай рабоце трэба прадаставіць вялікае поле дзейнасьці, трэба аказаць больш дапамогі. Наперадзе вялікая задача ў справе ўсяляцыя дысцыпліны, арганізаванасьці калгасу. Што за парадак, калі калгасьнікі выходзяць на работу ў 10-11 гадзін раніцы, а такіх фактаў колькі хочаце ў нашых калгасах. Палітаддзелы павінны арганізаваць калгасныя масы, увесьці цьвёрдую дысцыпліну ў калгасе. Хто будзе ім у іх рабоце перашкаджаць, таго партыя моцна прызве да парадку.

Наша задача сёньня заключаецца ў тым, каб менш гаварыць аб палітаддзелах, а больш аказаць ім сапраўднай дапамогі ў справе разгортваньня работы на месцах, каб была большая эфэктыўнасьць ад іх работы. Пастанова ЦК УсеКП(б) гаворыць ясна—арганізацыйны пэрыяд стварэньня палітаддзелаў пры МТС і саўгасах скончан. Праверка праведзена, вынікі добрыя. Наша задача—узмацніць палітаддзелы шляхам аказаньня ім штодзённай дапамогі, каб яны лепш маглі выканаць тыя адказныя палітычныя задачы, якія на іх усклала партыя.

На месцах ёсьць шмат фактаў, што работнікам палітаддзелаў не стваряюць неабходных умоў для работы. Цяпяуць з прадастаўленьнем памяшканьняў, цягнуць з работнікамі, не даюць пішучай машынкі і г. д. Адносяцца так—прыехаў ратавальнік, дык яму нічога не дамо. Больш таго, іншыя райкомы партыі дый сакратар райкому партыі і камсамолу бачаць, як быццам, у стваренні палітаддзелаў сабе канкурэнтаў. Іншы сакратар думае—вось прыехаў начальнік палітаддзелу, мяне зьнімуць і пасадзяць на маё месца начальніка палітаддзелу. І атрымліваецца так, што замест работы, замест аказаньня сапраўднай дапамогі работнікаў палітаддзелу, займаюцца розным глупствам.

Нам, таварышы, паведамляюць, што пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 11 мая аб рабоце МТС і палітаддзелаў на месцах сталі выкарыстоўваць супроць начальнікаў паліт аддзелаў. Моў, вы кепска, ганебна працуеце.

Сам факт такога тлумачэньня пастановы ЦК і СНК БССР гаворыць аб тым, наколькі на месцах няправільна разумеюць задачы палітаддзелаў і наколькі прабуюць некаторыя месцовыя раённыя работнікі выкарыстаць усякую акалічнасьць супроць начпалітаддзелаў МТС.

У парадку бальшавіцкай самакрытыкі трэба сказаць, што сама пастанова ЦК і СНК БССР у частцы, якая датычыць ацэнкі работы палітаддзелаў МТС (там гаворыцца: «Такое ста новішча (дрэнны ход сяўбы), зьяўляецца простым рэзультатам ганебнай работы кіраўніцтва МТС—дырэктараў і нач. палітаддзелаў).—няправільна ўжо таму, што дала падставу абвінавачваць начпалітаддзелаў у дрэннай рабоце і няправільна таму, што палітаддзелы ў гэтых МТС толькі прыступілі да работы, і ганебная работа МТС—рэзультат дрэннай работы ў першую чаргу дырэктара МТС і тым РК, якія да стварэньня палітаддзелаў МТС не кіравалі работай МТС, не дапамагалі ім і, па-трэцяе, таму няправільна, што сам ЦК і СНК, даючы такую характарыстыку работы начпалітаддзелаў аказаліся ня ў курсе работы гэтых палітаддзелаў МТС. Гэтыя памылкі трэба ўлічыць у далейшай рабоце і кіраўніцтве работай палітаддзелаў і іх не дапускаць. Асабліва моцна трэба падумаць аб дапамозе палітаддзелам РК партыі.

Партыя паслала ў БССР 37 лепшых работнікаў бальшавікоў у палітаддзелы, і мы не дазволім раённым работнікам перашкаджаць ім або не аказваць ім дапамогі ў іх вялікай сур'ёзнейшай партыйнай рабоце.

Вось як, таварышы, стаіць справа з пытаньнем аб палітаддзелах, іх ролі і адносінах да іх РК.

Наша задача—зараз сканцентраваць увагу на ворыве папараў, за свае часовае правядзеньне поліва, уборкі і работах па абавязковай здачы збожжа, бульбы дзяржаве.

Мы павінны так скарыстаць вопыт нашай работы па загатоўках у мінулым годзе і веснавой сяўбы гэтага году, так, каб партыйныя арганізацыі на месцах і палітаддзелы ў МТС і саўгасах сталі арганізатарамі мільённых мас калгасьнікаў, якіх мы сёньня падымаем на больш высокую ступень у справе сацыялістычнай арганізацыі працы, вытворчасьці і г. д. Нам трэба разгарнуць справу так, каб канчаткова была ў нас зжыта ўсякая славесная дэкларацыйнасьць і кіраўніцтва наогул.

Паболш канкрэтнай, апэрацыйнай справы, паболш увагі і выразнасьці ў рабоце на вёсцы, больш арганізаванасьці ў радох партыйных і камсамольскіх арганізацый, больш адказнасьці за даручаную партыяй справу. Так далей працаваць нельга. Мы павінны так паставіць сваю работу і дабіцца такога становішча, каб важнейшыя работы, пастаўленыя партыяй, а іменна пасьняховае правядзеньне ўборачнай і збожжазагатоўчай кампаніі мы правялі-б так, як гэтаму вучыць нас ленінскі ЦК на чале з нашым правадыром тав. Сталіным. **(Бурныя апляўдысмэнты).**

Усесаюзны рэйд „Правды" і паліткіраўніцтваў НКЗ і НКС па праверцы рамонту ўборачных машын

МАСКВА, 17. (БЕЛТА). **«Правда»** разам з паліткіраўніцтвам **Наркамзему і Нарамсаўгасаў** абвяшчае з 20 чэрвеня па 1 ліпеня г. г. 13-ты Усесаюзны рэйд ударнікаў «Праўды», шматтыражак паліткіраўніцтваў МТС і саўгасаў, а таксама рабкораў-чыгуначнікаў. Задача рэйду — праверыць у МТС і саўгасах рамонт уборачных машын і пры дапамозе чыгуначнікаў рабкораў-ударнікаў «Праўды» праверыць прасоўваньне ўборачных машын, накіраваных у МТС і саўгасы. З 20 па 23 чэрвеня рэйд праводзіцца ў **Бурсакоўскай, Праточнай, Мішкоўскай, Кушчаўскай МТС і саўгасе «Гігант»**, Паўночнага Каўказу; у **Палтаўскай, Разьдзельненскай, Вясёла-Куцкай, Днепрадзяржоўскай, Бапцкай і Кахоўскай** МТС Украіны; **Булатарыйскім і Сімферопальскім** саўгасах Крыму; **Пугачоўскай і Урупінскай** МТС Нижняй Волгі; **Безанчукскай** МТС Сярэдняй Волгі; у **Контэміраўскай** МТС ЦЧВ і **Барысаўскім** саўгасе Заходняй Сібіры. Ва ўсіх іншых МТС і саўгасах Саюзу рэйд праводзіцца з 23 чэрвеня.

АД РЭДАКЦЫІ «ЗЬВЯЗДЫ»: Цалкам далучаючыся да вдозвы «Правды» аб арганізацыі ўсесаюзнага рэйду ўдарнікаў «Правды», «Зьвязда» са свайго боку ўключаецца ў гэты рэйд і заклікае ўвесь друк БССР уключыцца ў гэта важнае палітычнае мерапрыемства.

Новая абстаноўка—новыя мэтады работы ў вёсцы

Апублікаваная ва ўчарашнім нумары «Правды» пастанова Цэнтральнага Камітэту партыі «АБ РАБОЦЕ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ МТС, АБ КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙЦЫ І АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ І РАЙКОМАЎ» мае актуальнейшае палітычнае значэньне ў барацьбе за бальшавіцкія калгасы.

Не падлягае сумненьню, што некаторыя райкомы партыі сустрэлі ў «штыхі» работнікаў палітаддзелаў. Факты гэтага роду ўжо прыводзіліся ў «Правде», у прыватнасьці 12 чэрвеня ў артыкуле «УСЯМЕРНУЮ ДАПАМОГУ ПАЛІТАДДЗЕЛАМ МТС І САЎГАСАЎ». Можна было-б прывесьці яшчэ нямала падобных фактаў. Пакажам хоць-бы на адносіны ГАЎРЫЛА-ЯМСКАГА райкому (Іваначўская вобласьць) да палітаддзелу МТС. Сакратар гэтага райкому тав. Шэньнікава адразу-ж пад крэсьліла, што палітаддзел «вядзе антыпартыйную лінію». Антыпартыйнасьць была ўгледжана ў тым, што работнікі палітаддзелу пачалі актыўную работу ў вёсках, «не дакладваючы кожны раз аб гэтым райкому». Райком забараніў сакратаром ячэек калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС, зьяўляцца на нарады, скліканыя палітаддзелам. «Начальнік палітаддзелу,—было заўважана на бюро райкому, — ПАВІНЕН ПАДПАРАДКАВАЦЦА РАЙКОМУ і без згоды бюро ня мае права выступіць па прынцыпова-палітычных пытаньнях» на тэй-жа падставе, што «кожны член партыі падпарадкуецца перш за ўсё тэй партарганізацыі, у якой ён знаходзіцца».

Гэта—з аднаго боку. А з другога — калі работнікі палітаддзелу папрасілі даць ім кватэры, старшыня і мясцовыя ўлады сказалі: «Вы работнікі ня нашы, а МТС — няхай яна і кватэры вам дасьць», або: «Арганізацыя палітаддзелу не прадугледжана планам, у нас няма матар'ялу для ўстаноўкі тэлефону ў палітаддзеле».

Яшчэ больш рашуча паступіў сакратар Свабодзінскага райкому Далёкаўсходняга краю. Ён ня стаў траціць па-пустому красамоўнасьці, як яго іншыя калегі. Ён проста паслаў судовую сэсію ў МТС, якая ў адсутнасьці работнікаў палітаддзелу і дырэктара зрабіла судовае расьследваньне і ўстанавіла, што пасьля прыбыцьця палітаддзелу... «справа ў МТС не папешылася, а пагоршылася».

Гэтыя і падобныя ім гора-кіраўнікі раённых арганізацый ўгледзелі ў прыначэньні палітаддзелаў толькі канкурэнцыю. Ім і неўздагадку, што новая абстаноўка работы ў вёсцы, вялізарнейшыя перамогі, якія атрымала партыя ў сацыялістычным будаўніцтве, КАНЧАТКОВАЯ ПЕРАМОГА КАЛГАСНАГА ЛАДУ ПАТРАБУЮЦЬ І НОВЫХ ФОРМ АРГАНІЗАЦЫІ, новых мэтадаў партыйнай работы. Яны нават і ня хочуць падумаць, што тэрытарыяльны прынцып арганізацыі партыі ў вёсцы ўжо невыстарчальны. Яны толькі палюйсяку, на словах прыняліі ўказаньні студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК і тав. Сталіна аб тым, што цяпер партыя больш адказвае за калгасную вытворчасьць, што партыйныя арганізацыі абавязаны ўваходзіць ва ўсе дробязі сельска-гаспадарчай вытворчасьці, што, нарэшце, павінны быць створаны калгасныя вытворчыя ячэйкі.

Калі-б яны захацелі зразумець сэнс пастановы ЦК аб арганізацыі палітаддзелаў, яны, можа быць, зразумелі-б, што гэта гістарычная пастанова партыі зьяўляецца невыпадковай, што яна цалкам і поўнасьцю вынікае з усяго развіцьця сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, з вялізарнейшых перамог, атрыманых партыяй.

Палітаддзелы працуюць усяго 3—4 месяцы, а ва многіх мясцох і таго менш. Але вопыт ужо паказвае, якую вялізарную карысьць прыносіць гэта новая форма партыйнай арганізацыі, гэты новы вагар работы нашай партыі. Палітаддзелы, стоячы бліжэй да калгасаў, будучы непасрэдна з імі зьвязанымі, здолелі за кароткі тэрмін у значнай меры ачысьціць калгасы ад варожых нам элемэнтаў. Усім вядома, як узьнялася працоўная дысцыпліна ў калгасах у цяперашнюю пасеўную кампанію, усім вядома, што ў калгасах стала значна больш гаспадарчага парадку. Не сакрэт таксама, што многія сельскія ячэйкі толькі ў гэту вясну па-сапраўднаму ўзяліся за вытворчыя пытаньні. Ніколі яшчэ ня быў такі высокі процант вясковых камуністаў, працуючых непасрэдна на вытворчасьці, як цяпер, і гэта ня можа ня даць сваіх станоўчых рэзультатаў. Усе гэтыя посьпехі дасягнуты нашай партыяй, дзякуючы больш канкрэтнаму кіраўніцтву калгасамі, і немалую ролю ў гэтым адыграла арганізацыя палітаддзелаў пры МТС і саўгасах.

Не аб падначаленьні палітаддзелаў райкомам павінна ісьці гутарка, а аб УСЯМЕРНАЙ І ЎСЯЛЯКАЙ ДАПАМОЗЕ ІМ З БОКУ РАЙКОМАЎ. Ня можа быць і гутаркі аб падначаленьні палітаддзелаў райкому, аб тым, што райком выкарыстоўвае работнікаў палітаддзелу для сваіх мэт, як напрыклад, прадаваў зрабіць Нагорны райком Кабардзіна-Балкарскай вобласьці. З гэтай спробы нічога, апрача канфузу, для райкомаў ня выйдзе.

Справа ня ў тым толькі, што ў вёскі паслана 10 тысяч адабраных Цэнтральным Камітэтам вытрыманых партыйных работнікаў. Справа ў НОВЫМ ВЫТВОРЧЫМ ПРЫНЦЫПЕ ПАРТЫ�йНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, СПРАВА У НОВЫХ МЭТАДАХ РАБОТЫ, АДПАВЯДАЮЧЫХ НОВАЙ АБСТАНОЎЦЫ Ў ВЁСЦЫ. У гэтым сутнасьць пастановы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб палітаддзелах.

Па такіх чыноўніках, бюракратах накшталт сакратара Свабодзінскага райкому, які прабаваў падмацаваць свае беззаконьня дзеяньні супроць палітаддзелу пасылкай судовай сэсіі ў МТС, трэба ўдарыць з усёй сілай. Такіх сакратароў, нарэшце, нямнога. Але ёсьць і такія, якія проста недаўмяваюць: «А што-ж цяпер будзе рабіць райком?». Пытаньне дарэмнае і нікуды ня вартае. Ні райкомы, ні тэрытарыяльныя ячэйкі ня зьнішчаюцца, як гэта відаць з пастановы ЦК. У райкоме работы больш чым даволі. І наогул з якога гэта часу паўстала пытаньне аб тым, што райкомам не хапае работы? Пакуль вядомы толькі выпадкі, калі многія райкомы не спраўляліся з работай.

Апрача таго вопыт сумеснай работы большасьці райкомаў партыі з палітаддзеламі паказвае, што пытаньне аб узаемаадносінах вырашаецца вельмі проста, калі галоўным клопатам раённых работнікаў зьяўляецца ня пытаньне аб «канкурэнцыі», а барацьба за бальшавіцкія калгасы, за гістарычны лёзунг партыі—узьняць усіх калгасьнікаў да ўзроўню заможнага, культурнага жыцьця. У гэтым выпадку мы маем дружную, згуртаваную бальшавікім энтузіязмам работу райкомаў з палітаддзелямі. Задача заключаецца ў тым, каб усюды была створана такая бальшавіцкая абстаноўка работы.

«Новыя ўмовы работы ў вёсцы,—гаворыцца ў апублікаванай пастанове ЦК,—патрабуюць... каб былі ліквідаваны трэньні паміж райкомамі і палітаддзеламі і была створана яснасьць у іх узаемаадносінах».

Асноўнае заключаецца ў тым, каб былі створаны ў калгасах моцныя ВЫТВОРЧЫЯ ячэйкі, цесна зьвязаныя з калгаснымі масамі, здольныя ажыцьцяўляць кіраўніцтва вытворчым жыцьцём калгасу. Калгасная ячэйка павінна стаць яшчэ бліжэй да вытворчасьці, чым цяпер. Цэнтр работы павінен быць перанесены ў ную брыгаду. Сыстэма груп і парторгаў у брыгадах сябе апраўдала. У «Правде» ... водзілася нямала фактаў, калі да, часта адстаючая, станавіла давой пасьля таго, як у брыгада арганізавана партыйная ... пачаў працаваць таповы ... арганізатар. Даволі ... цюю брыгаду калгасу ІМЯ ... Безанчукскай МТС. Тут парт... ганізатар тав. ЕЎСТЫГНЕЎ ... НЕБУДЗЬ МЕСЯЦ—ДВА ... ЗДОЛЕЎ ЛІТАРАЛЬНА ... ДЗІЦЬ БРЫГАДУ. Яна ... увесь час упераздзе ў гэтым ... бальшавіцкім калгасе. А ... арганізатара ня было, брыгада ... час лічылася адсталай і ... хвасьце. Цяпер ня павінна ... нэй калгаснай брыгады, у якой ... по-б партыйнай групы або ... га арганізатара.

Пастанова ЦК накіравана ... спроб асобных райкомаў ... палітаддзелам выкананьць ... дзеныя на іх партыяй, і ... пальныя ўказаньні, хто і ... павінен кіраваць калгасным ...

«Калгасныя ячэйкі, кандыдаты і групы спачуваючых ... якія АБСЛУГОЎВАЮЦЦА МТС ... цуюць пад кіраўніцтвам ... МТС і выконваюць, як ... для іх, дырэктывы палітаддзе... у межах пытаньняў дзейнасьці ... вызначаных пастановай ... ЦКК ад 7 студзеня 1933 году ... іншых пытаньнях жыцьця ... вецкае будаўніцтва, фінансы, ... прапаганда і інш.) ячэйкамі ... гасаў кіруюць райкомы, ... комы кіруюць тэрытарыяльнымі ... камі і вытворчымі ячэйкамі ... якія не абслугоўваюцца МТС, ... па ўсіх без выключэньня пы...

Райком зацьвярджае прыём ... чэньне з партыі, вядзе ўлік ... кандыдатаў партыі, а таксама ... ваючых і збор членскіх узносаў ... таддзел абавязан аказаць ... райкомам усямернае падтрыманьне.

Палітаддзел інфармуе ... сваіх мерапрыемствах па ... ячэйкамі, «ПРЫЧЫМ У ВЫ... РАЗГАЛОСЬСЯ ПЫТАНЬНЕ ... ШАЕЦЦА ПЕРШЫМ САКРА... АБКОМУ СУМЕСНА З НАЧАЛЬ... ПАЛІТСЭКТАРУ».

Партыя патрабуе безагаворачнага выкананьня яе рашэньняў аб ... пах. Для большай увязкі работы ... таддзелаў і райкомаў «пажадана, ... рыцца ў пастанове ЦК,—магчыма ... ста практыкаваць сумесныя ... пеньні і сумесныя пастановы ... роў райкомаў і начальнікаў ... ных палітаддзелаў МТС, выпуш... за іх сумеснымі подпісамі».

Пастанова ЦК дакладна і ... наўляе ўзаемаадносіны палітад... райкому. Гэтай-жа пастановай ... раюцца магчымасьці работы і ... палітаддзелаў у калгасах. Пры ... палітаддзеле будзе выходзіць ... штат палітаддзелу ўводзіцца ... пастаянны рэдактар гэтай газеты ... жанрарганізатар. Да кожнага ... лу прымацоўваецца кінопересоў... павінен быць створан кніжны ... кіёск.

МТС пры дапамозе палітадд... вінна стаць ня толькі арганізат... палітычным і гаспадарчым, але ... турным цэнтрам калгасных ... гэтым палітаддзелу павінны ... дапамагчы ўсе партыйныя арг... і райкомы ў першую чаргу.

(ПЕРАДАВАЯ «ПРАВДЫ», ПЕ... НАЯ ПА РАД...

ЗАМАЦАВАЦЬ ВЫНІКІ СЯЎБЫ УДАРНАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА УБОРК...

НАША РЭСПУБЛІКА ВЫКАНАЛА ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ. Да 14 чэрвеня засеяна **2.682.000** га — **100,1** проц. рэспубліканскага пляну.

Яравыя засеяны на **20** дзён раней мінулага году. Да 14 чэрвеня 1932 г. было засеяна толькі 2.401.000 га, або 85 проц. пляну.

ПЕРАВЫШАНЫ паказальнікі і 1930 году—году самых рэкордных ураджаяў. На 14 чэрвеня ў 1930 годзе было засеяна 2.263.000 га—95 проц. пляну.

Гэты факт—перамога буйнейшага значэньня. Ён знамянуе сабой гіганцкі рост палітычнай актыўнасьці працоўных мас вёскі, іх адпаасьці партыі Леніна-Сталіна. Першая бальшавіцкая сяўба другой пяцігодкі ярка прадэманстравала тыя карэнныя зрухі, якія адбыліся ў сьвядомасьці калгасных мас, у іх адносінах да калгаснай працы. Рухавіком гэтага новага магутнага ўздыму стаў лёзунг тав. **СТАЛІНА**—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Ленінскае спаборніцтва ўсё глыбей, усё мацней уваходзіць у жыцьцё калгасаў, у масы калгасьнікаў. Магутны размах прымаюць новыя сацыялістычныя формы працы у вёсцы. Вясна гэтага году асабліва знамянальна сур'ёзным **ПЕРАЛОМАМ** у якасьці сяўбы, ў якасьці арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Посьпехі пасеўнай бясспрэчны. Але яны ўсё-ж адсталі ад нашых магчымасьцяй. Мы перавысілі паказальнікі рэкорднага 1930 году. Мы значна абагналі і па тэмпах, і па якасьці веснавой сяўбы і мінулы год. Сяўба яравых па нашай рэспубліцы, аднак, зацягнулася. Страчаны, прынамсі, два тыдні. У нашых руках былі ўсе магчымасьці скончыць сяўбу значна раней.

У чым прычыны?

Веснавая сяўба красамоўна паказала, што цэлы рад партарганізацый яшчэ не перабудавалі сваёй работы. Замест бальшавіцкай мабілізацыі мас на пасеўны фронт—апартуністычны самацёк, алілюйшчына, славесная дэкларацыйнасьць. Замест канкрэтнага і апэрацыйнага кіраўніцтва сяўбой—адрыў ад калгасаў, ігнараваньне працоўных аднаасобнікаў—нашых заўтрашніх калгасьнікаў. Замест рашучай барацьбы з рэшткамі недабітага ворага і яго агентурай—прытуленьне клясавай пільнасьці, гнілы лібералізм, нуўменьне своячасова выкрыць і зруйнаваць манэўры клясавых ворагаў, якія выступаюць пад фальшыва - нацыянальным сьцягам. Вось што характэрна для гэтых арганізацый і вось чаму яны зацягнулі сяўбу.

Іменна аб гэтым сыгналізуюць урокі Магілеву, Віцебску, Гарадку, Сяроціна і іншых адстаючых раёнаў.

Асобна трэба спыніцца на Ві

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Чыстка яшчэ больш загартуе нашу партыю

„Ачышчэньне радоў партыі—неабходны працэс, такі-ж, як працэс ачышчэньня здаровага арганізму ад нездаровых элемэнтаў“ (Кагановіч)

САВЕЦКІЯ ПІСЬМЕНЬНІКІ—АКТЫЎНЫЯ УДЗЕЛЬНІКІ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

(Гутарка члена рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б—старшыні ЦКК КП(б)Б т. ЛЫЧОВА з пісьменьнікамі БССР 14 чэрвеня 1933 г.

— Мэта сёнешняй нарады, — гаворыць тав. ЛЫЧОЎ у сваім уступным слове, — гэта ПРЫЦЯГНУЦЬ САВЕЦКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ ДА АКТЫЎНАГА ЎДЗЕЛУ Ў ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ.

— Наша партыя — урэдавая партыя, да яе могуць прыліпаць з рознымі мэтамі тыя ці іншыя элемэнты. І ачысьціца ад такога балясту і сьмецьця думаем мы ня толькі ўласнымі рукамі, а прыцягваем мы шырокія колы беспартыйных працоўных мас, каб яны нам дапамагалі ў гэтай рабоце.

— Савецкія пісьменьнікі ў гістарычны момант нашай партыі павінны мабілізавацца на гэту справу. У нашай партыі ёсьць такія тыпы і героі, якіх трэба паказаць пакаленьням. Ёсьць у асобных мясцох і дрэнныя бакі і недахопы, якія зьяўляюцца разультатам апартуністычнай дзейнасьці раду камуністаў. Іх трэба ўскрываць і паказаць у літаратуры, тым самым дапамагчы нашай партыі выправіць іх.

* * *

Пасьля кароткага ўступнага слова тав. Лычова разгарнулася ажыўленая гутарка. Выказаліся т. т. ДУНЕЦ, ХАРЫК, ХВЕДАРОВІЧ, БЭНДЗ, ГАЛАВАЧ, КОЛАС, БЯДУЛЯ, ШАПАВАЛАЎ і інш. Выступаўшыя падкрэсьлілі важнае значэньне ўдзелу савецкіх пісьменьнікаў у чыстцы, неабходнасьць гэтай работы, як элемэнту актыўнага ўключэньня сябе ў барацьбу за чыстату радоў партыі, за паказ ролі партыі і за выкрыцьцё усяго нягоднага, што пад тым ці іншым відам прабралася ў рады ленінскай партыі. У выступленьнях былі высунуты рад практычных прапаноў аб удзеле пісьменьнікаў у чыстцы партыі.

Пасьля выступленьняў пісьменьнікаў тав. Лычоў падагуліў выказваньні.

— Пісьменьніцкія колы, партыйныя і беспартыйныя таварышы, зараз, іменна ў пэрыяд чысткі, змогуць, як ніколі, шырока і глыбока пазнаць нашу партыю.

Пры чыстцы, як ніколі, можна ўсебакова ўбачыць асобных партыйных работнікаў.

Тут таварышы скардзіліся, што маленькіх камуністаў і сярэдніх ведаюць, а вось пабольшых — ня ведаюць. Гэта, я думаю, ад таго, што вы мала зьвязаны з гэтымі людзьмі ў іх дзелавой рабоце. Калі ў вас зьявіцца патрэба пазнаць асноўнага работніка, мы вам дапаможам гэта зрабіць.

— Вы самі гаворыце, што ў нас у літаратуры слаба выведзены вобразы камуністаў. Камуніст гэта такі чалавек, які ня любіць сябе паказваць публічна. Ён робіць сваю справу і калі ён добра робіць, дык другія яго ўбачаць і скажуць аб ім, а сам ён сябе ніколі ня будзе выстаўляць. А ў часе чысткі камуністы «мімавоп» будуць расказваць сваю біяграфію і свае геройскія ўчынкі.

У нас 65-тысячная армія ў партыі. Матар'ялу хопіць. Вам трэба зараз пасьпяшыць, каб намецьць сабе пэўную праграму дзеяньня, вы атрымаеце ўвесь матар'ял, пачынаючы ад нізавых членаў партыі, сакратароў ячэек маленькіх прадпрыемстваў, сакратароў райкомаў партыі, старшынь РВК і канчаючы членамі ЦК і сакратарамі ЦК. Усё, што хочаце, вы можаце ўбачыць у адкрытую. Вы можаце самі прыйсьці і задаваць ім любыя пытаньні, што вас цікавіць. Гэта будзе толькі на карысьць нашай партыі.

— Вось якое перад вамі раскрываецца поле дзейнасьці. Мае рацыю тав. КОЛАС, які гаварыў, што наша нарада, — гэта ёсьць прадлог таго, каб нам зьбірацца часьцей і ўключыцца больш у работу нашай партыі. У нас няма ніякіх сумненьняў, што вы добрасумленна працуеце на сваім пасту, а ўсякі добрасумленны працоўны, калі ён па меры сваіх сіл і магчымасьцяй набліжаецца да нашай партыі, гэта і для яго карысна і для партыі.

У нас ёсьць шмат цікавага ў штодзённай рабоце, аб чым вы часамі і ня ведаеце, трэба сказаць, у большасьці часамі ня ведае. І нядрэнна, каб мы пазнаёміліся бліжэй, адзін другога ведалі-б лепш і г. д. У мяне поўная ўпэўненасьць у тым, што большасьць з вас, нават можа быць і ўсе 100 проц. прысутных прымуць той ці іншы ўдзел у чыстцы нашай партыі. У мяне ёсьць такая поўная ўпэўненасьць, бо вы тут усе выказаліся ў такім духу.

У нас зараз 29 раёнаў пачалі чыстку. Калі вы пасьля гэтай нарады крыху падумаеце і аформіце свой плян, куды вам накіраваць сваю ўвагу, мы вам дапаможам, каб гэта было вам даступна і ў Менску і ва ўсіх іншых мясцох, дзе ідзе чыстка. Вы тут убачыце і камуністаў ячэек заводаў, вы будзеце мець магчымасьць бачыць чыстку ўстаноў, некаторых з вельмі дрэнным мінулым, як напрыклад, НКЗ, Дзяржплян, Наркамасьветы, Наркамаховы здароўя. Тут чыстка будзе вельмі цікавая, цікавая з пункту гледжаньня таго, як члены партыі на вучастку, які партыя даверыла ім, праводзяць лінію партыі.

Вельмі цікава паказаць два раёны — суседы. Вось ТАЛАЧЫНСКІ раён. Якіх толькі перагібаў вы там ня сустрэнеце. А тут-жа побач БАРЫСАЎСКІ раён, які ішоў і па загатоўках і па сяўбе добра. Два розныя раёны. Як быццам на першы погляд аднолькавыя, а па сутнасьці розныя.

Апошняя заўвага і самая галоўная. Вы не павінны захапляцца асобнымі намуністамі. Кожны наш камуніст — гэта член калектыву і ён разам з калектывам робіць сваю вялікую справу па сацыялістычным будаўніцтве. Тым і моцная наша партыя, што яна дзейнічае калектыўнай воляй, і аддзельныя асобы — адны лепш, другія горш — выконваюць гэту калектыўную волю. Паказваць асобных камуністаў трэба, бо іх гераізм, іх вопыт — гэта школа і прыклад для ўсіх, асабліва для моладзі. Але за асобамі трэба бачыць калектыў — ПАРТЫЮ, і гэта асноўнае.

Вы, напэўна, чыталі артыкул МАКСІМА ГОРКАГА, апублікаваны ў «Правдзе». У гэтым артыкуле Максім Горкі заклікае ўсіх пісьменьнікаў уключыцца ў справу чысткі партыі. А ён-жа ня кідае ў паветра слоў. Я думаю, што ён і сам для чысткі што-небудзь зробіць. ЯГО ЗАКЛІК ВЫ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ.

Хроніка чысткі

20-VI-33 г., а 11 гадз. раніцы ў клюбе Карла Маркса гарком КП(б)Б сумесна з гарадзкой камісіяй па чыстцы склікае ўсіх членаў праверкомаў і сакратароў партыйных калектываў і ячэек па пытаньні АБ ХОДЗЕ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ ПА ГОРАДЗЕ. Яўка абавязкова.

Менгарком КП(б)Б.
Гар. камісія па чыстцы.

18 чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні прыродазнаўчага корпусу (Унівэрсытэцкі гарадок, 1 паверх, пакой 115) пачнецца чыстка членаў і кандыдатаў партыі парт'ячэйкі НДІ камбыхаваньня.

Праверком.

Дабіцца большай актыўнасьці

(На пасяджэньні Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б)

Учора на пасяджэньні Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б былі заслуханы інфармацыі 4-х куставых камісій аб ходзе чысткі.

Першым інфармаваў тав. СТАРАВОЙТАЎ — старшыня камісіі па чыстцы партарганізацыі друкарні ІМЯ СТАЛІНА. Камісія за апошнія дні ў друкарні імя Сталіна выявіла цэлы рад трывожных фактаў. Крытыка і самакрытыка не разгорнута. Большасьць камуністаў маў чаць і фактычна ня прымаюць удзелу ў чыстцы. Сходы штодня пачынаюцца са спазьненьнем на 30-40 мінут. Актыўнасьць вельмі слабая. Гарадзкая камісія накіравала ў друкарню імя Сталіна т. т. СУХАНАВУ і ГЕРШОНА для тэрміновага высьвятленьня прычын, якія прывялі да такога становішча.

На фабрыцы «КАМУНАРКА» з самага пачатку чыстка праходзіла вельмі дрэнна. Гэта таму, што партыйны калектыў да чысткі зусім не падрыхтаваўся. Апошнія дні далі значны зрух. Актыўнасьць павысілася. Кожны дзень выступае па 25—30 чалавек. Праверены 93 камуністы.

Але дрэнным і па сёнешні дзень на фабрыцы «Камунарка» зьяўляецца тое, што бальшавіцкай здаровай крытыкі яшчэ няма, выступаючыя слаба выяўляюць дрэнныя бакі тых ці іншых правяраемых таварышоў.

Засьмечанасьць партыйнай арганізацыі на «Камунарцы» досыць вялікая. Ужо выяўлена, што рэдактарам шматтыражкі зьяўляецца былы трацкіст БРЭГМАН. Шматтыражку ён прывёў да развалу. Член бюро партыйнага калектыву ЭПШТЭЙН — сын лішэнца, член партыі ФРЫДЛЯНД — таксама. На фабрыку і ў партыю пралезьлі нават кулацкія элемэнты, як ЛІНДЭ і інш.

З новымі кандыдатамі партыі работа амаль не праводзілася, наадварот, маюць месца такія факты: новы кандыдат КП(б)Б тав. ШАМЭТ не заплаціў членскіх узносаў за тры месяцы, сакратар ячэйкі БРЭГМАН адразу-ж яму заявіў: «Узносаў ня прыму. Ты мэханічна выбыў з кандыдатаў партыі». І тав. Шамэт пасьля таго на працягу 13 месяцаў нікому нікога не гаварыў і ўзносаў не плаціў.

Зусім непадрыхтаваным сустрэў чыстку КП(б)Б партыйны калектыў заводу імя МЯСЬНІКОВА. Камісіі прышлося першыя два дні аддаць выключна падрыхтоўчай рабоце.

Зараз камісія дабілася некаторых вынікаў ва ўзьняцьці актыўнасьці камуністаў і беспартыйных рабочых. Камсамол і па сёнешні дзень прымае недапушчальна слабы ўдзел у чыстцы. За 12 дзён чысткі ў спрэчках выступілі толькі 4 камсамольцы. Камісія на заводзе імя Мясьнікова выявіла, што да пачатку чысткі ніякай партыйнай вучобы ня было. 50 проц. камуністаў нават ня чыталі газэт.

На ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ чыстка прайшла пры актыўным удзеле ўсіх рабочых Зльводу. Асабліва каштоўным вопытам работы камісіі па чыстцы на электрастанцыі зьяўляецца тое, што быў арганізован ад рабочых «КАМУНАРА» сацыялістычны рахунак зльводаўцам. Гэты сацыялістычны рахунак зльводаўцы скарысталі для ўзьняцьця актыўнасьці ў правядзеньні чысткі, для ліквідацыі прарываў у падачы сьвятла і г. д.

ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б ПРАПАНАВАЛА ЎСІМ КАМІСІЯМ ВЫКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ ЗЛЬВОДУ і «КАМУНАРА» ПА АРГАНІЗАЦЫІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РАХУНКАЎ. У бліжэйшыя дні па гэтым пытаньні гарадзкая камісія праводзіць нараду ўсіх сакратароў партыйных калектываў і ячэек.

Павысіць авангардную ролю камуністаў на вытворчасьці

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Рамонтны цэх ф-кі імя **Клары Цэткін** налічвае 30 рабочых. Членаў і кандыдатаў партыі — 14, з іх у варштатаў—7. Астатнія—майстры і тэхнікі.. Але-ж, ня гледзячы на малы лік рабочых, рамонтны цэх мае вялікае значэньне для фабрыкі.

Ад работы рамонтнага цэху залежыць становішча машын, а значыць, і работа ўсёй фабрыкі. Аднак укладзеную на яго работу цэх выконвае дрэнна. Вядучы на фабрыцы цэх—**вязальны** мае вялікія перабоі ў рабоце з-за несваячасовага вырабу рамонтным цэхам эксцэнтрыкаў, цыліндрычных пружын і плятывавых кольцаў. Якасьць рамонту машын таксама кепская. Адрамантаваныя машыны звычайна работаюць 2-3 дні, а потым зноў становяцца на рамонт. З гэтай прычыны 3 машыны штодзённа стаяць.

Ячэйка вытворчымі пытаньнямі займаецца слаба. Камуністы не заўсёды паказваюць сваю авангардную ролю. Узяць хоць-бы члена партыі Нікіціна. З 40 зробленых ім эксцэнтрыкаў 36 аказаліся забракаванымі. Ячэйка не кіравала сацспаборніцтвам і ня вывучала ролю сваіх камуністаў у вытворчасьці. Вось чаму бракароб Нікіцін ашыпуўся ў ліку ўдарнікаў.

Дрэнна стаіць справа і з партыйна-масавай работай, яе ў цэху фактычна няма.

11 чэрвеня чыстку праходзілі т. т. **Юдэль, Розіна і Сямёнаў.**

Усе выступаўшыя на сходзе таварышы падкрэсьлілі, што т. Юдэль, як загадчык тэхнікай бясьпекі, сябе не апраўдаў. На радзе жывых прыкладаў паказваюць яго дрэнную работу. Вось нядаўна дрэнна ўстанавілі машыну, у выніку чаго ледзь не пацярпела работніца. Зьяўляючыся партпрымацованым да камсамольскай ячэйкі, Юдэль ні разу ня бываў у ячэйцы. Палітгурток ён не наведвае, хоць палітычна дрэнна падрыхтован.

Шмат выказваліся і адносна **Розінай.** Бацька Розінай доўгі час гандляваў на базары. А Розіна сказала пры праверцы, што яна—дачка краўца. На працы ў сталоўцы Розіна сябе не апраўдала і з работы не зьнялі. Сваю грамадзкую работу Розіна правальвае, партсходы не наведвае.

Зусім іншы партыйны твар у т. Сямёнава. Ён з дзяцінства працуе на найме, зараз ён качагар на фабрыцы. Усе выступаўшыя таварышы рэка мэндавалі т. Сямёнава, як аднаго з лепшых ударнікаў, самага актыўнага таварыша ў палітвучобе.

Партарганізацыя фабрыкі павінна ўлічыць выкрытыя недахопы ў рабоце ячэйкі рамонтнага цэху і рашуча перабудаваць партмасавую работу.

АБ СКЛАДЗЕ ЯЧЭЙКОВЫХ КАМІСІЙ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

Пастанова гарадзкой камісіі па чыстцы Менскай партарганізацыі

Назначыць камісіі па чыстцы вясковых парт'ячэек у наступным складзе:

Старшыня — СІНЕЎ В. А. — член партыі з 1905 г., дырэктар Саюзкуркі. **Члены: Карпенка Е. Р.** — член партыі з 1920 г., загадчык бюро скарагаў ГКК КП(б)Б—РСІ, **Язерскі Л. Ш.** — член партыі з 1922 г., нам. загадчыка склада друкарні імя Сталіна.

Прыводзіць чыстку ў наступных пунктах:

Астрашыцка-Гарадзецкі сельсавет—ячэйка Астрашыцкага Гарадка, саўгасу «Курганы», «1 мая»,; Папярнянскі сельсавет — яч. Папярнянскага сельсавету, саўгасу «Камсамолец», «Вішнёўка», «Бальшавік»; Бараўскі сельсавет—яч. Бараўскога сельсавету; Ратамскі сельсавет—яч. саўгасу «Тарасава», яч. калгасу «Кастрычніцкая рэвалюцыя», кандыдацкая група імя Варашылава; Калодзішчанскі сельсавет — Калодзішчанская яч., яч. торфзаводу; прыгарадны сельсавет—яч. саўгасу імя Лекерта, саўгасу «Чырвоны транспартнік», «Больная праца» (цэх з заводу імя Варашылава), яч. саўгасу імя Будёнага, калгасу імя Дзяржынскага, калгасу «Прабуджаная праца», кандыдацкая група калгасу ДПУ, яч. МТС.

Старшыня — БУКАЦІН І. І.—член партыі з 1919 г., нам. старшыні прэзыдыуму БКС. **Члены: ЮДЗІН Р. Я.** — член партыі з 1920 г., старшыня гаржыласоюзу, **КАМІНІЦКІ І. В.** — член партыі з 1925 г., нам. дырэктара заводу «Ударнік».

Прыводзіць чыстку ў наступных пунктах:

Караліішчавіцкі сельсавет — яч. Караліішчавіцкага сельсавету, Трасьцянецкі сельсавет — яч. Трасьцянецкага сельсавету, яч. Бальшавіцкай МТС; Кайкаўскі сельсавет — яч. Кайкаўскага сельсавету; Замастоцкі сельсавет—яч. Замастоцкага сельсавету; Навадворскі сельсавет — яч. Навадворскага сельсавету, яч. саўгасу «Заціпша», яч. садова-гародніцкага інстытуту; Абчацкі сельсавет — яч. саўгасу «Абчак-Горкі», абчацкая міжкалгасная ячэйка; Гатаўскі сельсавет — яч. Гатаўскага сельсавету, яч. саўгасу імя Калініна; Самахвалаўскі сельсавет — яч. Самахвалаўская, яч. саўгасу «Русінавічы», калгасу «Ленінскі шлях»; Сеніцкі сельсавет — Сеніцкая міжкалгасная ячэйка, саўгасу Сеніца; Падгайскі сельсавет — яч. Падгайскага сельсавету, саўгасу Прылукі, калгасу імя БАН; Строчыцкі сельсавет — Строчыцкая міжкалгасная ячэйка, ячэйка саўгасу «Строчыцы», калгасу імя Дзяржынскага; Грычанскі сельсавет — яч. Грычанскага сельсавету, калгасу імя Фалько; Крупіцкі сельсавет — Крупіцкая міжкалгасная ячэйка, яч. саўгасу «Самуолева».

Аб ходзе ворыва папараў

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Падняцьце папараў у БССР праводзіцца недапушчальна марудныміі тэмпамі. На 10 чэрвеня па БССР плян ворыва папараў выкананы толькі на 8,8 проц., што стварае яўную пагрозу невыкананьня плянаў ва ўстаноўлены партыяй і ўрадам тэрмін.

У той час, калі перадавыя раёны МТС, саўгасы і калгасы своячасова яшчэ ў ходзе сяўбы пераключыліся на ворыва папараў і зараз ужо завяршаюць гэту работу (Парыцкі раён — 89,2 проц., Быхаўскі — 66,4 проц., Чырвонаспадобзкі — 51,7 проц., Плешчаніцкі—40,3 проц.), рад раёнаў у выніку апартуністычнай недавацэнкі ворыва папараў, якое зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам для падняцьця ўраджайнасьці, праводзяць гэту работу самацёкам. Раёны — Полацкі, Расонскі, Сіроцінскі, Бешанковіцкі, Чашніцкі, Крулскі, Гарадоцкі, Сураскі, Лёзьнянскі, Сеньненскі, Бялыніцкі, Дубровенскі, Мсьціслаўскі, Лагойскі, Чэрвеньскі, Клічаўскі Асіпавіцкі, Прапойскі, Крычаўскі, Чырвонапольскі, Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі, Церахаўскі, Любаньскі, Тураўскі, Лельчыцкі, Мазырскі, Глускі, Пятрыкоўскі, Ельскі, Нараўлянскі, Лоеўскі, Камарынскі Хойніцкі і Віцебскі — зусім не займаюцца ворывам папару і ня лічаць сваім абавязкам канкрэтна заняцца гэтай справай і нават не даюць вестак аб ходзе выкананьня ўядыму папараў па раёне.

Таксама лічыць зусім нездавальняючай работу па ўздыме папараў у Барысаўскім (выканана 2,6 проц.), Асьвейскім (0,4 проц.), Бабруйскім, Талачынскім і інш. раёнах.

Такая работа сьведчыць аб тым, што многія раёны, саўгасы, МТС і калгасы ня ўлічылі ўрокаў пасеўнай кампаніі і недапушчальна зацягваюць уздым папараў.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. За недапушчальную бязьдзейнасьць у справе падняцьця папараў папярэдзіць сакратароў райкомаў, старшынь райвыканкомаў і загадчыкаў райзаў Тураўскага, Чырвонапольскага, Хойніцкага, Чашніцкага і Жлобінскага раёнаў і папярэдзіць усе астатнія раёны, што ЦК будзе прымушан прымаць жорсткія меры партыйнага ўзьдзеяньня, калі не працягу чарговай пяцідзённі ня будуць узяты тэмпы, забясьпечваючыя выкананьне плянаў падняцьця папараў ва ўстаноўленыя тэрміны.

2. Паставіць на від дырэктарам трактарацэнтраў т. т. Грэбенчыку і Дубоўскаму за адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва МТС па ўзьняцьці папараў і абавязаць іх у сувязі са сканчэньнем сяўбы пераключыць усе трактары на ворыва папараў і скончыць усю гэту работу ва ўстаноўлены тэрмін.

3. Прапанаваць усім РК, РВК, дырэктарам МТС і саўгасаў забясьпечыць пераключэньне ўсёй наяўнай цягавай сілы (конскай і мэханічнай) на безадкладнае ворыва папараў і дабіцца поўнага выкананьня пляну па сэктарох ва ўстаноўленыя тэрміны.

4. Шляхам шырокай мабілізацыі калгаснага і савецкага актыву, арганізацыі грамадзкага кантролю за якасьцю выконваемай работы, даючы рашучы адпор усім праяўленьням кулацкіх тэорый аб малкім ворыве — забясьпечыць ворыва на ўстаноўленую глыбіню ў 12-15 сант. і добраякасную апрацоўку папараў, своячасовую вывазку гною на папар, правільнае ворыва і культывацыю.

5. Лічыць зусім недапушчальнай і нецярпімай далейшую недаацэнку справы апрацыйнага ўліку ходу выкананьня ўсіх сельска-гаспадарчых работ, у тым ліку і папаравай кампаніі.

Абавязаць сакратароў РК, старшынь РВК забясьпечыць своячасовае прадстаўленьне вестак Наркамазему, прыцягваючы да адказнасьці вінаватых у несваячасовым і няпоўным прадстаўленьні справаздачнасьці.

6. Даручыць Наркамазему тав. Бэнэку прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, вінаватых у няпрысутным ўстаноўленай справаздачнасьці.

Абавязаць пракурора рэспублікі даць указаньні мясцом аб тэрміновым разгляздзе перадаваемых справаў.

Рашуча выкараніць антыпартыйныя адносіны да палітаддзелаў

З практыкі двухмесячнай работы палітаддзелаў Полацкай МТС прыходзіцца канстатаваць, што кіруючыя работнікі раёну не ўсьвядомілі новых задач работы вёскі, у разрэзе задач, пастаўленых стэнаграмскім пленумам ЦК і ПКК УсеКП(б) і што ў наяўнасьці недаацэнка ролі і задач палітаддзелу. Для пацьвярджэньня гэтага даволі прывесьці некалькі прыкладаў.

Хутка, пасьля прыезду, палітаддзел лічыў неабходным склікаць нараду сакратароў калгасных парт'ячэек раёну дзейнасьці МТС. Аказалася, што гэта магчыма зрабіць толькі з дазволу райкому. Нараду адкрыў заг. арг. аддзелам райкому партыі. Выступіў сакратар райкому, і ня гледзячы на тое, што палітаддзел — справа новая, ён ніводнага слова аб задачах палітаддзелу і практычнай дапамозе яму ў рабоце не сказаў. Гэта паказала, што сакратар райкому сам не зразумеў, якую вялікую палітычную і практычную дапамогу ў асобе палітаддзелу ён атрымаў. Далейшыя факты паказалі больш. Яны паказалі, што райкомшчыкі разумелі, што палітаддзел ім проста не патрэбен, а таму можна не зварочваць на яго ўвагі і працаваць па-старому.

Рэдактар раённай газэты «Чырвоная Полаччына» тав. **Рабіновіч** адмовіўся зьмясьціць артыкул нач. палітаддзелу аб выяўленых фактах кляўсавай барацьбы ў калгасах, шкодніцтве кулака і аб тым, што работнікі, пасланыя райкомам у калгасы, не праводзяць там масавай работы і не рэагуюць на адміністраваньне (у калгасе «Варашылава», Бельскага сельсавету, сакратар партыйнай ячэйкі ў прысутнасьці ўпаўнаважанага райкому і РВК, вывесіў наступную аб'яву: «На агульны сход 22-V абавязаны зьявіцца ўсе 100 проц., не зьявіўшыяся калгаснікі будуць аштрафаваны на 5 працадзён». Гэта аб'ява вісела да прыходу ў калгас працаўнікоў палітаддзелу).

Сакратар райкому тав. **Яўсеенка** на 2-м тыдні пасьля арганізацыі палітаддзелу ня гледзячы на адсутнасьць у апошняга службовага памяшканьня, адмовіў у перасылцы ў ЦК КП(б)Б пакетаў, тлумачачы: «Вы нам улянце ў капеечку,—перасылка кожнага пакету каштуе нам рубель», а машыністка райкому катэгарычна адмовілася друкаваць палітдзяжэнне палітаддзелу, заяўляючы: «Вы статутам партыі не прадугледжаны і я вас абслугоўваць не павінна».

На бюро райкому і прэзыдыуму РВК выносяць «прамавое» папярэджаньне дырэктару МТС за ход сяўбы, без яго прысутнасьці і бяз ведама нач. палітаддзелу.

За подпісам сакратара райкому тав. Яўсеенка перадаецца тэлефонаграма —«Усім сакратарам парт'ячэек, нач. палітаддзелам: выходзячы з дырэктывы ЦК КП(б)Б, прапануецца прапрацаваць пастанову аб чыстцы партыі»...

Палітаддзел выяўляе кулацкія элемэнты, мабілізуе калгаснікаў на выключэньне гэткіх з калгасаў, а райвыканкомы іх (Булаўскі і Шацілаўскі с-саветы) і на пратэст палітаддзелу, заг. райза тав. **Шырынкаў** заяўляе: «Ну, яшчэ чаго не хапала, каб з кожным палітаддзелам угаджаць ды і не абанякова ў яго прысутнасьці пераглядваць».

—Уся «бяда» ў тым,—ня раз выказваўся сакратар райкому тав. Яўсеенка,—што па Полацкім раёне арганізавана чатыры палітаддзелы, таму і «цяжкавата» з імі працаваць.

З прычыны адсутнасьці транспартных сродкаў, палітаддзел ня раз ставіў пытаньне перад сакратаром райкому і старшынёй РВК, аб неабходнасьці, хоць-бы на час пасеўнай прымацаваць да палітаддзелу адзінае месца ня парадку чарговасьці ад устаноў і арганізацый, якія маюць коней,—усё гэта засталося «добрым пажаданьнем».

Пераброска насельня, коней і людзей з калгасаў, абслугоўваемых Полацкай МТС, як правіла, праводзіцца бяз ведама МТС і палітаддзелу, ня толькі па асабістым распараджэньні сакратара райкому і старшыні РВК, але і ўпаўнаважаных райкому. Гэта прыводзіць да абязьлічваньня загадчыкаў вытворчых вучасткаў МТС і дырэктара.

Ніводнага працаўніка ў распараджэньне палітаддзелу для скарыстаньня на практычнай рабоце ў калгасах і брыгадах у час пасеўнай выйсьці ня даў. Рад сакратароў ячэек, якіх трэба было зараз-жа замяніць з-за шкодніцтвасьці («Сталіна 2», «Авангард», «Трактар», «Чырвоная Зорка»),—«паўтара месяца райкомам партыі «падбіраюцца».

Склікаецца раённы зьлёт калгаснікаў, рабкораў, а палітаддзел даведваецца аб гэтым ад калгаснікаў, а не ад райкому, бо ўсё гэта робіцца праз галаву палітаддзелу.

Такая недаацэнка палітаддзелу з боку райкому і РВК бязумоўна мае ўплыў і пераносіцца ў ячэйкі. Пасобныя сакратары парт'ячэек (Сосьніцкі і Булаўскі сельсаветы) проста супраціўляюцца правядзьмым палітаддзелам мерапрыемствам, ня выконваюць указаньняў. Так напрыклад, пам. нач. палітаддзелу прапанаваў сакратару Булаўскай парт'ячэйкі правесьці нараду брыгадных агітатараў, а калі прадэманстраваў выкананьне гэтага ўказаньня, сакратар заявіў: «Чаго вы ходзіце па калгасах? Якія там чысткі па брыгадах? Я рабіла тое, што мне прапануе райком, а не палітаддзел». Або зьнімаецца адзіны камсамолец-ударнік з брыгады і прымачаецца ліставаецам, а на рашучы пратэст палітаддзелу, сакратар ячэйкі заяўляе: «а я ўсё-такі зрабіла па-свойму». Урэшце, зроблена было так, як патрэбна было ў інтарэсах партыі, але факт супраціўленьня ў наяўнасьці.

Няўжо Полацкі райком і РВК не займуцца пытаньнямі канкрэтнай дапамогі палітаддзелам, а будуць далей тармазіць работу палітаддзелу і яшчэ патрабуецца аўтарытэтнае і сур'ёзнае ўмяшаньне ЦК КП(б)Б?

Нач. палітаддзелу Полацкай МТС—БЕРЗІНГ.

АД РЭДАКЦЫІ: «ЗЬВЯЗДА» патрабуе неадкладнага рэагаваньня на антыпартыйныя адносіны Полацкага РК КП(б)Б да палітаддзелу МТС і чакае павейамленьня, што канкрэтна ўжыта для ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 чэрвеня «Аб рабоце палітаддзелаў МТС, аб калгаснай ячэйцы і аб узаемадносінах палітаддзелаў і райкомаў».

„Дробязі“ на Асінторфе

(Ліст рабочага)

На Асінторфе забясьпячэньне рабочых механічнага цэху не пастаўлена на належную вышыню. Абслугоўваньне спажыўкаапэрацыяй з рук вон дрэннае.

Сталоўка працуе таксама дрэнна. Ёсьць факты разбазарваньня прадуктаў, сямейнасьць і г. д. Па заяве рабочых Арпінскае РСІ абсьледавала сталоўку і выявіла, што торфкопам перабрака з рабочых за абеды 25.000 руб. За хлеб прыходзіцца плаціць два разы: у сталоўцы і ў краме. Гэтыя факты і рад іншых засталіся і на сёнешні дзень, ня гледзячы на абсьледаваньне РСІ.

Неабходна тэрміново зьнішчыць па казаныя недахопы і забясьпечыць бесперабойнае выкананьне праміфінпляну.

Р. Ігнаценка.

У дапамогу агітатару

ЗАКОН АБ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ НА 1933 ГОД

XVII партыйная канфэрэнцыя падкрэсьліла, што ў другой пяцігодцы задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове аб «Рабоце на вёсцы» на студэнцкім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) паставіў перад намі задачу — зрабіць калгасы сацыялістычнымі ня толькі па форме, але і па сутнасьці. І новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку на 1933 год пабудован так, што ён дапамагае сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў.

Новы закон дапамагае арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў

Арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў патрабуе своячасовага выкананьня і перавыкананьня плянавых заданьняў па сяўбе як на колькасных, так і па якасных паказальніках. У выкананьні плянавых заданьняў сяўбы зацікаўлены як калгаснікі, так і пралетарская дзяржава. І новае палажэньне аб сельска-гаспадарчым падатку накіравана на ўмацаваньне плянавай дысцыпліны, іменна: закон устанаўляе, што ў аснову вылічэньня падаткаў кладзецца плошча яравога пасеву, вызначаная паводле пасеўных плянаў адпаведных органаў — з аднаго боку, і ўлічаная плошча азімых культур, сенажацяй і шматгадовых насаджэньняў — з другога боку. Такі падыход пры падліку аб'ектаў абкладаньня на пасеўных плошчах бязумоўна карысны для тых гаспадарак, якія з посьпехам вядуць барацьбу за выкананьне і перавыкананьне плянаў сяўбы, бо зусім вызваляецца ад абкладаньня звышплянавы пасеў.

Тыя-ж гаспадаркі, якія не вядуць барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу, лодырнічаюць, не працуюць шчыра, павінны будуць заплаціць сельска - гаспадарчы падатак з разьліку плошчы, вызначанай плянам для сяўбы, незалежна ад таго, наколькі выкананы гэты плян.

Указаны прынцып уліку пасеўных плошчаў будзе дапасаван у бягучым годзе і да аднаасобных працоўных гаспадарак.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў патрабуе ўкараненьня ў гаспадарчае жыцьцё новай працоўнай дысцыпліны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, **«арганізацыі самага строгага і ўсенароднага ўліку і кантролю над вытворчасьцю і разьмеркаваньнем прадуктаў»**, павышэньня **«ў агульным маштабе прадукцыйнасьці працы»** (Ленін), павышэньня ўраджайнасьці. Палажэньне аб сельска-гаспадарчым падатку заахвочвае калгаснікаў, выконваючых плян, на барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці, на ўзорную пастаноўку ўліку і справаздачнасьці: «Перадавыя калгасы, якія на справе выканалі і перавыканалі плян павышэньня ўраджайнасьці, узорна паставілі ўлік і справаздачнасьць, атрымліваюць скідку з колькаснага акладу падатку ў разьмеры да 25 проц. — адзначае пастанова ўраду. Гэтыя сумы ў якасьці прэміі павінны выдавацца лепшым брыгадам, пасобным калгаснікам-ударнікам, якія забясьпечылі павышэньне ўраджайнасьці і ўзорна паставілі ўлік працы. І таму партыйным, савецкім і гаспадарчым арганізацыям неабходна мабілізаваць калгасы, брыгады, калгаснікаў на барацьбу за права атрыманьня прэміі за ўздым ураджайнасьці.

Некаторыя пасевы ільну не абкладаюцца

Патрэбнасьць нашай прамысловасьці ў сыравіне ў цяперашні момант абапіраецца рост тэхнічных культур, ня гледзячы на нашы значныя посьпехі. Закон аб сельска-гаспадарчым падатку накіроўвае на заахвочваньне да разьвіцьця тэхнічных культур. Ён, у прыватнасьці, зусім не абкладае падаткам у калгасных і аднаасобных працоўных гаспадарках усіх пасеваў ільну-даўгунцу, на канопляне і на цаліне, узаранай з восені, пасеваў канапель у канапляводчых раёнах, сьпіс якіх складаецца адпаведнымі органамі. Астатнія пасевы ільну-даўгунцу, пасевы канапель у іншых раёнах абкладаюцца па ільготнай стаўцы: у калектыўных гаспадарках па палове стаўкі збожжавых культур, у аднаасобных працоўных гаспадарках па норме збожжавых культур.

Закон спрыяе разьвіцьцю сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Тав. **Молатаў** у сваім дакладзе на студэнцкім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) «Задачы першага году другой пяцігодкі» сказаў: «Гэты год павінен стаць паваротным у росьце сацыялістычнай жывёлагадоўлі, што мае вялізарнае значэньне як для самой сельскай гаспадаркі, так і для далейшага паляпшэньня справы харчовага снабжэньня нашых гарадоў». Палажэньне аб сельска-гаспадарчым падатку накіравана на ажыцьцяўленьне вышэй прыведзенага



НА СТАДЫЁНЕ ІМЯ 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР (МЕНСК).

Тры дні банальных размоў

БАЛЯНС УСТУПНАЙ ЧАСТКІ ЭКАНАМІЧНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

ЛЁНДАН, 16 (БЕЛТА). На трашнім вячэрнім пасяджэньні скончылася першая — уступная частка лёнданскай канфэрэнцыі. За мінулыя тры дні пасьпелі выказацца некальк дзесяткаў прадстаўнікоў вялікіх дзяржаў і малых краін да Албаніі і Сан-Дамінго уключна.

Ня гледзячы на ўсе жаданьні захаваць відочнасьць, быццам на канфэрэнцыі робіцца сур'ёзная справа, ужо ў канцы другога дня месцы дэлегатаў у вялізарнай сваёй частцы пуставаілі, а на месцах прадстаўнікоў друку аставаліся толькі адзіночкі. Старшыня францускай дэлегацыі пасхаў у першы-ж дзень, неадкладна пасьля сваёй прамовы. Калі стала ясна, што стварэньне ў Лёндане адзінага фронту даўжнікоў ПАЗШ не ажыцьцёўна ў рэзультаце пазыцыі, заняцай Англіяй, — далейшае прабываньне **Даладзе** ў Лёндане стала зусім лішнім. Выехаў таксама **Дольфус**, увосны ў кшэні пазыку ў 13 млн. фунтаў стэрлінгаў для выратаваньня Аўстрыі ад германскай небясьпекі.

Астатнія дэлегаты абмяркоўваюць пераважна ў кулуарах і асабліва ў буфэце ўсе апошнія чуткі аб тым, што адбываецца па-за канфэрэнцыяй: аб сакрэтных нарадах англа-франка-амэрыканскіх банкіраў, якія спрабуюць знайсьці нейкія небудзь агульныя формулы для вырашэньня пытаньня аб ваенных даўгох і аб стабілізацыі суадносін паміж фунтам стэрлінгаў і далярам. Ніхто нават не прабаваў утойваць, што **сапраўдная справа робіцца толькі там, на пасяджэньнях банкіраў.**

Выбар старшыні першай камісіі не выклікаў асаблівых спрэчак. Нэйтральная кандыдатура галяндзкага прэм'ер-міністра Колійна ня сустрэла сур'ёзных пярэчаньняў. За тое спрэчкі разгарэліся вакол выбару прэзыдыуму фінансавай камісіі. Аднак, пасьля заключэньня кампрамісу па пытаньні аб чэрвеньскім плацяжы, Англія падтрымала амэрыканскую кандыдатуру і на пост старшыні фінансавай камісіі быў абран амэрыканец **Кукс**, а француз **Бонэ** дакладчыкам. Сёньня абедзьве камісіі прыступаюць да работы.

* * *

ЛЁНДАН, 16. (БЕЛТА). На першым кароткім пасяджэньні фінансавай камісіі, якое адбылося сёньня раніцою, старшыня **Кокс** (дэлегат ПАЗШ) заклікаў да «максімуму справы, мінімуму размоў». Выбраўшы рад падкамісій, фінансавая камісія спыніла свае работы да 19 чэрвеня.

Колін (галяндзкі дэлегат, старшыня эканамічнай камісіі) на першым пасяджэньні эканамічнай камісіі прапачаваў адмовіцца ад прамоў агульнага характару.

Камісія таксама спыніла свае работы да 19 чэрвеня.

Далучэньне СССР да рэзалюцыі аб мытным перамір'і

ЛЁНДАН, 15. (БЕЛТА). Адначасова з унясеньнем рэзалюцыі аб скасаваньні ўсіх маючых сілу законадаўчых і адміністрацыйных мер, якія носяць характар эканамічнай агрэсіі, тав. ЛІТВІНАЎ лістом на імя старшыні эканамічнай канфэрэнцыі Макданальда ПАВЕДАМІЎ АБ ДАЛУЧЭНЬНІ СССР ДА РЭЗАЛЮЦЫІ АБ ЭКАНАМІЧНЫМ ПЕРАМІР'І, прынятай арганізацыйным камітэтам, падрыхтоўваўшым скліканьне канфэрэнцыі. У лісьце ўказваецца, што СССР ДАЛУЧАЕЦЦА НА ТЫХ ЖА УМОВАХ, НА ЯКІХ ДА ГЭТАЙ РЭЗАЛЮЦЫІ ДАЛУЧЫЛІСЯ ІНШЫЯ КРАІНЫ. Эканамічнае перамір'е прадугледжвае непрыняцьцё краінамі, якія далучыліся да яго, новых мер, якія маглі-б павялічыць існуючыя зарудненьні сусьветнага гандлю.

Англа-амэрыканскі кампраміс у пытаньні даўгоў

ВАШЫНГТОН, 16. (БЕЛТА). **Рузвэльт** прыняў прапанову Англіі ўнесьці 10 млн. даляраў «у знак прызнаньня даўгавога абавязацельства да канчатковага ўрэгуляваньня пытаньня аб даўгох». Плацеж будзе зроблен у срэбры з разьліку 50 цэнтаў унцыя. Срэбра набыта Англіяй у Індыйскага ўраду.

Францыя адмовілася плаціць чарговы ўзнос

ПАРЫЖ, 16. (БЕЛТА). Францускі пасол ў Вашынгтоне **Лябуле** ўручыў амэрыканскаму ўраду ноту аб тым, што 15 чэрвеня Францыя не ўнясе плацяжу па міжсаюзніцкіх даўгох.

Нота ўказвае, што францускі ўрад спадзяваўся, што праблема аб даўгох будзе ўрэгулявана да 15 чэрвеня ў адпаведнасьці з пастановай францускай палаты дэпутатаў ад 13 сьнежня мінулага году. Гэтага, аднак, не адбылося. Вось чаму францускі ўрад адкладвае плацеж ад 15 чэрвеня, «не адмаўляючыся ад дабра ахвотна ўзятых на сябе абавязацельстваў».

ІТАЛІЯ ПЛАЦІЦЬ...

РЫМ, 16. (БЕЛТА). Італьянскі ўрад пастанавіў унесьці ў лік доўгу Амэрыцы 1 млн. даляраў у доказ прызнаньня доўгу і чаканьня заключэньня ў найкарацейшы тэрмін канчатковай згоды. Плацеж адбыўся 15 чэрвеня шляхам узносу Н'юёркскаму манэтнаму двару 2-х млн. унцый срэбра.

Японскія плаваньні падзелу Кітаю

ШАНХАЙ, 16. (БЕЛТА). Па думцы амэрыканскай часопісі «ЧАЙНА УІКЛІ РЭВ'Ю», японцы лічаць так званую нэйтральную зону у правінцыі ХОБЭЙ сумежнай тэрыторыяй МАНЧЖОУ-ГО і зусім не намераны перадаць кантроль кітайскай паліцыі і вывесьці войскі з нэйтральнай зоны. Яны таксама намераны ў бліжэйшым будучым узмацніць ваенныя дзеяньні ў ЧАХАРЫ, каб далучыць і гэты вялікі рэён да Манчжоу-Го.

Польскім гарняком пагражае галодная сьмерць

ППС СПЭКУЛЮЕ НА НЭНДЗЫ РАБОЧЫХ МАС

ВАРШАВА, 15. (БЕЛТА). У сувязі з масавым закрыцьцём каменавугольных шахт, пэнсэйскі саюз гарнякоў пад моцным нацыскам беспрацоўных шахцёраў прапанаваў міністру працы і міністру гандлю і прамысловасьці абавязаць прадпрыемцаў унесьці у фонд выдачы дапамог беспрацоўным і інвалідам па 1 злотаму з кожнай праданай тоны вугалю. «РОБОТНІК» піша, што «масавыя звальненьні, закрыцьцё і затапленьне шахт, скарачэньне рабочага тыдню — кінулі ГАРНЯЦКІЯ МАСЫ У ПАГРАЖАЮЧУЮ БЕДНАСЬЦЬ. ГАЛОДНАЯ СЬМЕРЦЬ ПАГРАЖАЕ І ТЫМ ГАРНЯКОМ, якія працуюць некалькі дзён на тыдзень, і тым, якія пры звальненьні амаль не атрымоўваюць ніякай дапамогі. Галодная сьмерць пагражае таксама пэнсіянэрам і інвалідам працы».

ВЫПАДКІ ГАЛОДНАЙ СЬМЕРЦІ МЕЛІ МЕСЦА Ў САМЫМ ЦЭНТРЫ ВАРШАВЫ. На Пазнанскай вуліцы памерла беспрацойная ПЛАСАН; На Данцыгскім вакзале выяўлен труп згінуўшага ад зьнясіленьня беспрацоўнага ГОРЭЯ.

НОВЫЯ ТЭРАРЫСТЫЧНЫЯ АКТЫ АЎСТРЫЙСКІХ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТАЎ

ВЕНА, 16. (БЕЛТА). У разе месц Аўстрыі зарэгістраваны новыя тэрарыстычныя акты нацыянал-сацыялістаў. Перарэзан кабель, які злучае **Вену** з **Зэмэрынгам**. Перарваны таксама тэлефонная сувязь **Вены** з паўднёвай **Аўстрыяй**. У самай Вене паломаджан рад тэлефонных установак на вуліцах і плянцох. З правінцый паведамляюць аб новых дэманстрацыях нацыянал-сацыялістаў.

Паранены нацыянал-сацыялістамі кіраўнік тырольскага хэймвэру **Штэйдле** атрымоўвае лісты, у якіх яму пагражаюць: «у наступны раз будзем цэліцца лепш». Атульны лік арыштаваных нацыянал-сацыялістаў у Аўстрыі даходзіць да 1200 чалавек, сярод якіх каля 80 бургамістраў, некалькі дзесяткаў жандараў і судзьдзяў.

ГЕРМАНСКІ ФАШЫЗМ ТРАЦІЦЬ ГРУНТ

Забарона нацыяналісцкай арганізацыі ў Дортмундзе

БЭРЛІН, 15. (БЕЛТА). У **Дортмундзкай** акрузе забаронена арганізацыя партыі нацыяналістаў «**Дэйчэр Камфрынг**». Забарона матывуецца тым, што за апошні час у гэту арганізацыю ўступіла шмат былых членаў забароненых «марксыцкіх арганізацый».

Кіраўніцтва «Камфрынгу» згодна заявы паліцэйпрэзыдэнта ня можа справіцца з сваімі ніязвымі членамі, якія выйшлі з паслушэнства.

Кіраўнік «Камфрынгу» **Бісмарк** у загадзе прапануе ўсім мясцовым арганізацыям правесьці строгую праверку сваіх членаў і выключыць з арганізацыі ўсіх асоб, якія пасьля пер шага студзеня 1932 г. актыўна працавалі ў рэйхсбаньеры, с. д. партыі, кэмпартыі ці бліжэйшых да іх арганізацыях.

Крах буйнейшага амэрыканскага банку

ВАШЫНГТОН, 14. (БЕЛТА). Закрыўся «Мэрчэндс Нэйшэ Хоэл Бэнк» з укладамі звыш 11 млн. даляраў. Гэта—буйнейшы банкаўскі крах з часу банкаўскага мараторыя.

У САУНАРКОМЕ СССР

НАРАДА СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І РАЙВЫКАНКОМАЎ

МАСКВА, 16. (БЕЛТА). 14-16 чэрвеня г. г. ў Саўнаркоме СССР адбылася нарада са старшынямі сельсаветаў (ад 25 сельсаветаў) і райвыканкомаў (ад 16 РВК).

На нарадзе былі абмеркаваны пытаньні: 1) аб умацаваньні апарату сельсаветаў у сувязі з правядзеньнем жыцьцё закону аб абавязковых пастаўках сельгаспрадуктаў і 2) аб скарачэньні справаздачнасьці сельсаветаў.

Прынятыя пастановы па гэтых пытаньнях будуць апублікаваны.

Конкурс на лепшыя навуковыя творы 1933 г.

МАСКВА, 17. (БЕЛТА). Камісія сацдзейнасьці вучоным пры **СНК СССР** абвяшчае конкурс на лепшыя навуковыя творы 1933 г. Навуковыя творы, прадстаўленыя на конкурс, павінны быць арыгінальным укладам у сусьветную навуку, вырашаць асноўныя праблемы сацыялістычнага будаўніцтва, вызваленьня СССР ад імпартнай залежнасьці і ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Першая прэмія конкурсу ўстаноўлена ў 15 тысяч рубл. і будзе насіць імя **М. Горкага.**

КАЛГАС „НОВЫЯ БАХРАВІЦЫ" ПАТРАБУЕ ТЭРМІНОВАГА АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ

(Ліст калгасьнікаў)

Ужо ня раз пісалася ў цэнтральным і раённым друку аб злачынствах у калгасе «Новыя Бахравіцы», але і дагэтуль ніякіх мер з боку Дудзіцкага сельсавету і Пухавіцкага РВК ня ўжыта.

Праўленьне гэтага калгасу засьме чана кулацка-заможнымі элемэнтамі. Старшыня праўленьня **Сянкевіч Кастусь** да ўступленьня ў калгас, апрача заможнай гаспадаркі, меў саматужную шавецкую майстэрню і трымаў кожны год 2-3 рабочых, якія зімой працавалі ў майстэрні, а летам на гаспадарцы.

Член праўленьня **Пікулік** меў шмат зямлі і жывёлы, якую перад уступленьнем у калгас разбазарыў. Меў вялікі сад, якім і зараз карыстаецца, з даходам каля 12 тыс. руб. у год, апрача гэтага эксплёатаваў беднату, даючы сельска-гаспадарчыя машыны на адработак.

Другі член праўленьня **Макась Міхась** таксама эксплёатаваў беднату, у яго быў батраком Сарока Сьцяпан.

Рахункаводам калгасу працуе **Аляксютовіч А. М.**—былы заможнік, якога сход пастанавіў зьняць з работы, але старшыня Сянкевіч і дагэтуль яго тры мае на рабоце.

Уся гэта група кулакоў і падкулачнікаў праводзіць шкодніцкую дзейнасьць з мэтай разбурыць калгас. На прыклад, кулака, былога паліцэйскага, **Шэлега Кандрата,** старшыня калгасу ўвесь час трымаў у калгасе і толькі пасьля фактаў, зьмешчаных у «Зьвязьдзе» ад 4-XII-32 г. ён вымушан быў Шэлега выключыць з калгасу. Але-ж і тут без падтрыманьня гэтага кулака не абышлося, бо замест разьліку з ім грашыма, Сянкевіч разьлічыўся збожжам. Жонцы кулака Шэлега і зараз даюцца калгасныя коні езьдзіць на базар, даюцца прадукты і г. д.

Кулаку Шэлегу Сянкевіч выдаў даведку ад калгасу і гэтым даў магчымасьць яму пралезьці на працу ў горадзе.

У калгасе ёсьць шмат фактаў раз базарваньня маемасьці і безгаспадарчасьці. Напрыклад: прапала 2 цялят якіх пасьвіў сын старшыні, згное на 1.800 пудоў бульбы, Шэлег Кандрат схаваў у гной хамуты, старшыня Сянкевіч пакраў калгаснае жыта і прысвоіў 200 руб. грошай і інш...

Але-ж усе гэтыя факты замазваюца старшынёй Дудзіцкага сельсавету **Бэсманам** і некаторымі працаўнікамі Пухавіцкага раёну. У калгасе пануе заціск самакрытыкі. За выступленьне на сходзе старшыня Сянкевіч пагражае выключэньнем з калгасу. У такім-жа духу прайшла і чыстка калгасу і як вынік яе—кулакі з калгасу ня выкінуты.

Брыгада калгасьнікаў (10 подпісаў).

АД РЭДАКЦЫІ:

Чакаем тэрміновага рэагаваньня на гэты ліст з боку Пухавіцкай РКК-РСІ, аздаравленьня памянёнага калгасу і паведамленьня аб выніках.

З А Г А Д

па кіраўніцтву ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР

Гор. Менск, № 130. *13-га чэрвеня 1933 г.*

Пры паведваньні мною Сіроцінскай райашчадкасы ўстаноўлена, што:

1. Меўшая месца растрата работнікамі сіроцінскай райашчадкасы 16 тысяч руб. выцекла ў выніку бязуважлівых адносін да работы райашчадкасы, адсутнасьці сталага кантролю за работай апарату і злачынных адносін да ўліку каштоўных паперак з боку заг. райашчадкасы **Бесарабскага.**

2. **Бесарабскі,** зьяўляючыся загадчыкам райашчадкасы, незаконным атрыманьнем і выдаткаваньнем сродкаў даваў повад для раскрадваньняў дзяржаўных сродкаў работнікамі свайго апарату (акт рэвізіі).

3. Райашчадкасай не раздана пазыкатрымальнікам аблігацый пазыкі «4-га завяршальнага году» на 129 тыс. р. і рэнейшых пазык на 17 тыс. руб. (апошнія тэрміны даўно прайшлі.

4. Ня гледзячы на развал і неўкамплектаванасьць апарату райашчадкасы, на перадачу аблігацый, зусім нездавальняючы ход рэалізацыі пазыкі (62 проц.), дрэннае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў, нездавальняючае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў II-га кварталу (60 проц.), заг. райашчадкасы тав. **Бесарабскі** пакінуў ашчадкасу бяспрытульнай, без намесьніка, не паведаміў аб гэтым кіраўніцтва АК і ДК БССР і выехаў у савет для іншых работ, у той час, калі кіруючымі органамі забаронена на час рэалізацыі пазыкі скарыстоўваць на іншых работах работнікаў ашчадкас.

5. Ад'яжджаючы ў савет, Бесарабскі пакінуў работнікам ашчадкасы на вялікую суму падпісаных блянак патрабаваньняў на атрыманьне грошай у аддзяленьні дзяржбанку ў той час, калі такія зьявішчы спрыяюць раскрадваньню дзяржаўных сродкаў.

6. Адсутнасьць на час адлучкі Бесарабскага ў ашчадкасе блянак пераводаў ф. № 10 спыніла пераводныя апэрацыі, у выніку чаго склаліся справядлівыя, дыскрэдытуючыя ашчадкасу паракалы ні з боку кліэнтаў.

7. У выніку адсутнасьці з боку райашчадкасы кіраўніцтва нізавой сеткай, апошняя і асабліва Вобальская ашчадкаса, якая мае 2-х штатных работнікаў, праяўляе поўную бязьдзейнасьць, аб чым сьведчыць наяўнасьць у Вобальскай, існуючай 3 гады ашчадкасе, толькі 11 тыс. руб. укладаў, ахоп падпіскай рабочых торфзаводу толькі на 66 проц., выкананьне на 0 проц. пляну па калектыўнаму страхаваньню жыцьця і перэалізацыя гэтай касай ні на адзін руб. аблігацый сярод аднаасобнікаў за наяўны разьлік.

8. Райашчадкасай ня ўжыта ніякіх мер да актывізацыі работы ў галіне ашчадсправы і рэалізацыі пазыкі прадпрыемстваў сувязі і лістаносцаў. У выніку прадпрыемствы сувязі і лістаносцы Сіроцінскага раёну, на чале з заг. райаддзелу сувязі тав. **Зенчанка,** бязьдзейнічаюць у галіне ашчадсправы, зусім не рэалізавалі пазыкі сярод насельніцтва і ў паштова-тэлеграфных ашчадкасах абдываецца сыстэматычны адліў укладаў.

9. Сельсавет, у якім увесь час знаходзіцца заг. райашчадкасы Бесарабскі, у выніку яго бязьдзейнасьці, знаходзіцца па рэалізацыі пазыкі ў апошніх радох. Бязьдзейнасьць Бесарабскага ў гэтым савеце тлумачыцца і тым, што ім нічога ня зроблена ў галіне калектыўнага страхаваньня па савету.

Выходзячы з вышэйсказанага, загадваю:

1. Загадчыка сіроцінскай райашчадкасы **Бесарабскага,** кантралёра вобальскай ашчадкасы **Нікіценку** і касіра вобальскай райашчадкасы **Федчука** з работы зьняць і прыцягнуць да судовай адказнасьці.

2. Паставіць пытаньні перад унаўнаважаным Нар. Кам. Сувязі аб прыцягненьні да адказнасьці загадчыка Сіроцінскага аддзелу сувязі **Зенчанка.**

3. Абавязваю сіроцінскую райашчадкасу на працягу 7 дзён раздаць пазыкатрымальнікам выплачаныя аблігацыі, як пазыкі «4-га завяршальнага году пяцігодкі», так і ранейшых пазык.

4. Папярэджваю заг. ашчадкас, што пры выяўленьні падобных зьявішч кіраўніцтва АК і ДК БССР будзе ўжываць да вінаватых самыя жорсткія меры ўзьдзеяньня.

Начальнік Кіраўніцтва Ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР САЎКОЎ.

спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы закончыліся

Масква і Ленінград занялі першыя месцы

16-га чэрвеня на ўсебеларускім стадыёне ў Менску закончыліся ўсесаюзныя спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы.

Калёны ўдзельнікаў з калектываў Масквы, Ленінграду, Горкага, Іванаўска-прамысловай вобласьці, ЦЧВ, УССР, Узбэкістану, Закаўказьля, Беларусі, Карэліі, рабочых спартсмэнаў Швэцыі і Аўстрыі выстраіліся перад трыбунамі.

Парад прымаў старшыня ВОФК БССР тав. **Закоўскі.**

З прамовай, падагульваючай вынікі сьвяткаваньня 10-годзьдзя фізкультурнай арганізацыі БССР і ўсесаюзных спаборніцтваў выступіў намесьнік старшыні ВОФКВ тав. **Кузьняцоў.**

Ад імя ўдзельнікаў спаборніцтва тав. **Бяссонаў** вынес падзяку ЦК КП(б)В, ураду, фізкультурникам Беларусі і іх кіраўніком за добры прыём, які забясьпечыў выразнае правядзеньне сьвята.

Заключны дзень на стадыёне пачынаецца масавым бегам на 1.000 мэтраў для ўсіх удзельнікаў сьвята. У 9 забегах бягуць бакёры, барцы і цяжкія атлеты.

Затым старшыня навукова-мэтадычнага камітэту ВОФК БССР тав. Макітон абвяшчае вынікі камандных спаборніцтваў па ўсіх відах. Першае месца па барацьбе і па падняцьці цяжараў заняла **Масква,** застаўшыся на другім месцы па боксу.

Агульныя вынікі камандных спаборніцтваў наступныя: па **падняцьці цяжараў** першае месца заняла **Масква,** другое — **Ленінград,** трэцяе—**Украіна,** чацьвертае — **Закаўказьзе,** пятае — **БССР,** шостае — **Горкаўскі край.**

Па боксу першае месца—Ленінград другое — **Масква,** трэцяе — **Украіна,** чацьвертае — **БССР.**

Па барацьбе першае месца—**Масква,** другое — **Украіна,** трэцяе — **Карэлія,** чацьвертае —**Паўночны Каўказ,** пятае — **Закаўказьзе,** шостае — **Горкаўскі край,** сёмае — **Ленінград,** восьмае — **БССР.**

У заездах вялёсыпедыстаў прынялі ўдзел лепшыя вялёгонщыкі Масквы і СССР т. т. **Купрыянаў, Сямёнаў** і інш. Разьгрываюцца сярэдні паміж камандамі **Масквы, Харкаву, Менску** і **Адэсы.**

Ракавіна трэку напаўняецца рокатам матораў. Пачынаюцца гонкі вялёсыпедыстаў з лідэрамі. Гоншчык **Г. Казлоў** з лідэрам **Сакаловым** праходзіць 10 кілёмэтраў, устанавіўшы новае дасягненьне для Менску — 8 мінут 41,4 секунды. Вядомы вялёгонщычык П. Іпаліатаў у 1932 годзе прайшоў тую-ж дыстанцыю больш чым за 9 мінут.

Час другога ўдзельніка гонак Ерохіна за лідэрам Нікольскім — 8 мінут 49,2 секунды.

У камандным заезьдзе вялёсыпедыстаў Масквы, зборнай Харкаву, Менску, Адэсы перамагла Масква з часам 11 мінут 14,3 секунды.

Вялікую зацікаўленасьць выклікала выступленьне дыскмаўцаў.

За тры дні сьвята ўстаноўлена 11 усесаюзных рэкордаў, што сьведчыць аб павышэньні спартыўна-тэхнічных дасягненьняў.

Што паказалі спаборніцтвы

Намесьнік старшыні ВОФК БССР тав. **Кузьняцоў** у гутарцы з нашым карэспандэнтам сказаў наступнае аб выніках спаборніцтваў.

У мантажы здымкі т. т., якія занялі першыя месцы ва ўсесаюзна-ка-атлетычных спаборніцтвах.

1) Баскатаў (Масква)—барацьба; 2) Іваноў (Масква)—барацьба; 3) нафонтаў (Масква)—бокс; 4) Рапапорт (Ленінград)—падыманьне цяжараў; 5) Ілюхін (БССР)—цяжары; 6) Міхайлаў (Ленінград)—бокс; 7) Арутюнаў (Закаўказьзе)—бокс; 8) Цапавальнікаў (Масква)—бокс; 9) Шаляпін (Масква)—бокс; Абарцум'ян (ЗСФСР)—цяжары; Булычоў (Масква)—бокс; Ф. (Масква)—барацьба; Лебедзеў (Ленінград)—бокс.

Зьлева зьверху ўніз: Цімафееў (Ленінград)—бокс; Люпякоў (Масква)—цяжары; Янковіч (Украіна)—бокс.

Справа зьверху ўніз: Папоў (Украіна)—цяжары; Шэтаў (Ленінград)—цяжары; Золатаў (Ленінград)—барацьба.

Як сьвята дзесяцігодзьдзя, так і ўсесаюзныя спаборніцтвы ператварыліся ў вялікую дэманстрацыю тых посьпехаў, якія ёсьць у фізкультурным руху Савецкага саюзу.

Значная падрыхтоўчая работа пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі забясьпечыла выразнае арганізаванае правядзеньне ўсіх вызначаных мерапрыемстваў.

Аб гэтым сьведчыць тое, што спаборніцтвы прыцягнулі тысячы людзей.

Для БССР сьвята набыло вялікае значэньне і таму, што фізкультурнікі сталіцы БССР — Менску набылі вопыт у арганізацыі вялікіх фізкультурных сьвят. Вопыт і тэхніка лепшых майстроў Саюзу па цяжкай атлетыцы будуць перанесены ў нізавыя калектывы.

Вынікі сьвята і спаборніцтваў паказалі агульны рост фізкультурнага руху. Наперакор усялякім прадказаньням апартуністычных элемэнтаў у фізкультурным руху аб тым, што з увядзеньнем комплексу «ГПА» намечалася скарачэньне сьвяткаваньня, спаборніцтвы паказалі зваротнае.

Разам з ростам усяго фізкультурнага руху расьцуць і спартыўна-дасягненьні, заснаваныя на масовасьці.

Склад удзельнікаў сам гаворыць сябе Са 182 чалавек адзі 104 з іх рабочыя.

Наяўнасьць у складзе ўсесаюзных спаборніцтваў [illegible] коў усіх нацыянальнасьцяў [illegible] ову, а таксама шэдзкіх і [illegible] спартсмэнаў падкрэсьлівае [illegible] янальны характар сьвята.

Задача фізкультурных [illegible] БССР — максімальна [illegible] уздым і замацаваць дасягн[illegible] кі з тым, каб да надыходзя[illegible] ной спартакіяды прыйсьці [illegible] шымі паказальнікамі.

Адказны рэдактар Г. Н. БР[illegible]

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм **БЭЛА ДОННА**

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Мастацкі фільм **„А Э Л І Т А"** (АНТА!... АДЭЛІ!... УТА!...)

„ПРАЛЕТАРЫ" Мастацкі замежны фільм **„Чалавек, які сьмяецца"** драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. Мастацкі фільм **САЛДАЦКІ СЫН** у 6 частках.

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **КРЫЖ І МАУЗЭР** драма ў 7 частках.

АНОНС! Дзіцячы **ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР** Савецкая, 90.

АНОНС! Гэтымі днямі **НАЙЛЕПШЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ**

ПЕРАМОЖЦЫ

НОЧЫ

ВЫДАВЕЦТВА „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

прапануе былым рабочым і служачым выдавецтва, якія не атрымалі

аблігацыі пазык,

атрымаць іх **да 25 чэрвеня г.г.**

Па сканчэньні гэтага тэрміну аблігацыі будуць перададзены ў ашчадкасу ў абязьлічаным выгляцьці.

Выдавецтва „Сав. Беларусь".

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ

абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

студэнтаў па факультэтах:

I. Плянава-эканамічны: а) прамысловае аддзяленьне, б) сельска-гаспадарчае аддз., в) плянаванье працы. 150 асоб на дзен., 90 асоб на вячэрн.

II. Фінансава - эканамічны: 120 асоб дзен., 60 асоб вячэрн. (крэдытн. аддз.).

III. Кааперацыйны факультэт: 60 асоб дзен. (малочна-маслянае аддз.), 30 асоб вяч. (плянава-эканамічнае аддз.).

IV. Народна-гаспадарчага вучоту: 50 асоб дзен. (па будаўніцтву і кам. гаспадарцы), 75 асоб вяч. (па прамысловасьці і с.-гаспадарцы).

У Інстытут прымаюцца а с о б ы, ва ўзросьце ад 17 да 35 год, не пазбаўленыя выбарчых правоў.

Усе паступаючыя ў ВНУ, незалежна ад сканчэньня сярэдняе школы (рабфак, тэхнікум, дзевяцігодка), падлягаюць прыёмным іспытам па роднай мове і літаратуры, матэматыцы, фізыцы, хэміі і грамадазнаўстве ў аб'ёме курсу рабочых факультэтаў.

УВАГА: Асобы, якія не прадставілі дакумантаў аб сканчэньні сярэдняй школы,—трымаюць іспыты і па эканомгеаграфіі.

Да заявы, у якой указваецца, на які факультэт жадае паступіць, прыкладаюцца ў арыгінале дакументы аб асьвеце, даведкі ЗАГС'у аб нараджэньні, пасьведчаньне ад лекавай установы, 2 фота-карткі і заверэная анкета.

Прыём заяў да 1-VIII—33 г.

Іспыты—з 1 па 15-VIII—1933 г.

Адначасова з гэтым праводзіцца прыём на рабфак Інстытуту Народнай Гаспадаркі.

На II-гі курс 3 дзенных групы і на III-ці курс 3 дзенных і 5 вячэрніх груп.

Заявы накіроўваць—Менск, Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 709, канцылярыя Інстытуту Народнай Гаспадаркі.

Дырэктар Інстытуту Народнае Гаспадаркі БССР **ГУРЛО.**

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ з 1-га ліпеня на часопісы:

„ТЕАТР І ДРАМАТУРГІЯ" грамадзка-палітычная, мастацка-сачная часопісь тэатр., драматургіі і тыкі. Часопісь выходзіць на добрай аб'ёмам у 10 друк. аркушаў, у [illegible] афармленьні па ўзоры заменных сяй. У кожным нумары 4 шматк[illegible] укладкі і шмат ілюстрацый, [illegible] спосабу мацца-тынто, фота[illegible] кага друку.

Падпісная цена: 12 мес.—12 р., 6 [illegible] 3 мес.—18 р.

Падпіску можна здаваць [illegible] красавіка месяца, г. зн. з № 1.

„СОВЕТСКОЕ КИ[illegible] орган расійскай асацыяцыі рэжы[illegible] кінематографіі.

Часопісь ахоплівае ўсе галі[illegible] савецкай кінематографіі. 12 нумароў.

Падпісная цена: 12 мес.—24 р., 6 [illegible] 3 мес.—6 р.

Падпіска прымаецца ўсімі аддзе[illegible] пошты і саюзпруку.

Своечасова зданая падпіска [illegible] акуратную дастаўку.

Журнальна-газ[illegible] аб'яднань[illegible]

БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ „ДРЭЎБРЫКІ" ПАТРЭБНЫ:

лесаводы-лесаупарадкавальн[illegible]

на сталую работу ў выпуск[illegible] партыі.

Зварачацца па адрасу: г. [illegible] Камсамольская і К. Маркса, [illegible] памяшканьне Ўпаўнаркамле[illegible] кой № 24.

Дырэкцы[illegible]

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культур нага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снабжэньня наапэрацыі каап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецтва і аддзел абвестак—21-358; вучотна-тыражны сэктар—21-360; кантора выдав.—21-885; друкарня—

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № [illegible]